# МАСТАЦТВА
## (АЙЧЫННАЯ І СУСВЕТНАЯ МАСТАЦКАЯ КУЛЬТУРА)



**6 клас**





З электронным дадаткам

# МАСТАЦТВА
# (АЙЧЫННАЯ І СУСВЕТНАЯ МАСТАЦКАЯ КУЛЬТУРА)

Вучэбны дапаможнік для 6 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання

(з электронным дадаткам)

*Дапушчана*
*Міністэрствам адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

Мінск
«Адукацыя і выхаванне»
2016

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

УДК 7.03(100)(075.3=161.3)
ББК 85(0)я721
М32

Аўтары: Ю. Ю. Захарына, С. І. Колбышава, В. А. Грачова, А. А. Маруноў

Пераклад з рускай мовы *Т. А. Івановай*

Рэцэнзенты: кафедра гісторыі і тэорыі мастацтваў установы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў» (дацэнт кафедры, кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт *Н. С. Валанцэвіч*); настаўнік айчыннай і сусветнай мастацкай культуры, настаўнік па класе фартэпіяна вышэйшай катэгорыі дзяржаўнай установы адукацыі «Гімназія № 8 г. Мінска» *А. У. Міхайлоўская*

**Мастацтва** (айчынная і сусветная мастацкая культура) :
М32 вучэб. дапам. для 6-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання : (з электронным дадаткам) / Ю. Ю. Захарына [і інш.] ; пер. з рус. мовы Т. А. Івановай. — Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2016. — 128 с. : іл. + 1 электрон. апт. дыск.

ISBN 978-985-471-927-6.

**УДК 7.03(100)(075.3=161.3)**
**ББК 85(0)я721**

**ISBN 978-985-471-927-6 (асоб. выд.)**
**ISBN 978-985-471-929-0**

© Іванова Т. А., пераклад на беларускую мову, 2016
© Афармленне. РУП «Выдавецтва “Адукацыя і выхаванне”», 2016

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# Дарагія сябры!

У пятым класе вы пазнаёміліся з рознымі відамі мастацтва. Вы адкрылі для сябе новыя імёны, даведаліся пра цікавыя і яркія мастацкія творы, наведалі музеі і выставачныя залы. Мастацтва стала для вас намнога бліжэйшым і зразумелым.

У шостым класе вы зможаце адкрыць яшчэ адны дзверы ў свет дзівосных фарбаў і гукаў, экспрэсіўных формаў і ліній, выразных слоў і рухаў. Вы даведаецеся, як ужо знаёмыя вам віды мастацтва ўзаемадзейнічаюць і размаўляюць адзін з адным. У садружнасці мастацтваў з'яўляюцца новыя віды — цырк, тэатр, кіно.

Вучэбны дапаможнік, які вы трымаеце ў руках, дасць вам магчымасць акунуцца ў чароўны свет тэатра, пабываць на здымачнай пляцоўцы, пазнаёміцца з вядомымі рэжысёрамі і артыстамі. Акрамя таго, вы даведаецеся пра сучасныя віды мастацкай творчасці, якія ствараюцца пры дапамозе камп'ютарных тэхналогій.

У рабоце вам паспрыяе кампакт-дыск, які ўключае не толькі творы мастацтва, але і творчыя заданні. Спасылкі на кампакт-дыск, якія змешчаны ў вучэбным дапаможніку, пададзены наступнымі ўмоўнымі абазначэннямі: для твора выяўленчага мастацтва выкарыстоўваецца значок , літаратурнага тэксту — , музычнага твора — , кінематаграфічнага твора — .

Выкарыстанне іншых інфармацыйных крыніц абазначаецца значком .

У якасці дадатковага матэрыялу вам прапануюцца літаратурныя, музычныя, фестывальныя і іншыя старонкі, якія дапамогуць адказаць на пытанні і выканаць заданні. Дадатковы матэрыял пазначаны значком .

У добры шлях!

*Аўтары*

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# Уводзіны

Архітэктура, скульптура, жывапіс, музыка і паэзія справядліва могуць быць названы колерам жыцця.

*Ге́рберт Спе́нсер*



**Вінсэ́нт Ван Гог.** Зорная ноч

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

*Мастацтва суправаджае чалавека ўсё жыццё. Ад калыханак, пачутых упершыню з вуснаў маці, — да найвялікшых твораў дойлідаў, скульптараў, жывапісцаў…*

*Кожная сустрэча з мастацтвам нараджае новыя эмоцыі, стварае новы настрой. Адны творы мастацтва супакойваюць ці заварожваюць. Другія — надаюць мужнасці, рашучасці. Трэція — выклікаюць радасць і задавальненне.*

*Для кагосьці мастацтва — захапленне, а для кагосьці — магчымасць адкрыць таямнічыя старонкі гісторыі ці нават прафесія! Але для кожнага чалавека мастацтва — гэта спосаб спазнаць свет і самога сябе.*

## § 1. Вечныя тэмы ў мастацтве

Мастацтва — нязменны спадарожнік чалавека. Але калі з'явілася мастацтва? Што лічыць першымі творамі мастацкай культуры? Як адрозніць твор мастацтва ад таго, што мастацтвам не з'яўляецца? І сёння на гэтыя пытанні няма дакладнага і адназначнага адказу.

Навукоўцы з усяго свету — мастацтвазнаўцы, археолагі, гісторыкі — выказваюць мноства здагадак і тэорый пра першаасновы мастацтва. Але ўсе тэорыі падобныя ў адным. Мастацтва з'явілася



Наскальны малюнак з пячоры Пеш-Мерль (Францыя)



Сфінкс і піраміда Хеóпса (Егіпет)



Замак Гагенцóлерн (Германія)

тады, калі чалавек пачаў усведамляць прыгажосць свету і імкнуцца прыўнесці яе ў сваё жыццё.

З той пары як чалавек пачаў прыстасоўваць пячоры і гроты пад жыллё, у яго з'явілася жаданне ўпрыгожваць свой прыстанак. З першабытных часоў на сценах і скляпеннях пячор захаваліся сляды чалавечых далоняў, хвалістыя паралельныя лініі, якія нагадваюць макароны, геаметрычныя фігуры, малюнкі жывёл. Менавіта ў тыя далёкія часы і нарадзілася мастацтва.

Мастак заўсёды імкнецца выразіць у творах свой погляд на свет. Нягледзячы на тое што мастацкія каштоўнасці пастаянна змяняюцца, асобныя тэмы і вобразы па-ранейшаму застаюцца запатрабаванымі. Адной з такіх значных тэм у мастацтве з'яўляецца ***тэма гісторыі***.

Троіцкі касцёл (г. п. Відзы, Беларусь)

Мастацтва стасуецца з чалавекам праз час. Усыпальні фараонаў, каралеўскія палацы дораць нам свае шматвяковыя скарбы. Адкрываючы іх, мы разгадваем таямніцы мастацкага майстэрства, знаёмімся з дасягненнямі чалавека ў розных сферах дзейнасці.

У творах розных відаў мастацтва аўтары імкнуцца паказаць найбольш важныя моманты ў жыцці грамадства, з якіх складаецца гісторыя цывілізацый, дзяржаў, нацый. Дзякуючы мастацтву мы даведваемся, як узводзіліся грандыёзныя грабніцы, непрыступныя


Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Юдаль Пэн.**
Вуліца ў Віцебску

замкі, велічныя саборы, як вяліся бітвы, як змянялася мода… Мы даведваемся, як змяняўся чалавек — гасудар, военачальнік, дваранін, памешчык, селянін, рабочы.

Гістарычную значнасць уяўляюць і карціны на ***бытавую тэму***. У іх майстры мастацтва адлюстроўваюць непаўторныя імгненні з жыцця людзей розных краін і эпох.

На карціне Ю́даля Майсеевіча Пэ́на «Вуліца ў Віцебску» перад намі адкрываецца від на адзін з куткоў роднага горада беларускага мастака. Вуліца, забудаваная шматкватэрнымі дамамі, не пустэльная. Асветленая яркім сонцам, яна напоўнена жыццём. Паўсюль — людзі, занятыя паўсядзённымі справамі.



**Раіса Кудрэвіч.** Сяброўкі

Яркія, сакавітыя фарбы лета перадаюць радасны настрой дзвюх маладых жанчын на карціне беларускай мастачкі Раісы Уладзіміраўны Кудрэ́віч. Звычайную сцэну — сустрэчу

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Іван Шышкін.**
Ручай у лесе (на касагоры)

сяброўках і іх размову пра патаемнае — мастачка паказала з хваляваннем і любоўю. Адна жанчына чытае ліст. Яе сяброўка проста марыць. Ззянне жаночага шчасця напаўняе кампазіцыю цяплом і святлом.

Улюбёнай тэмай мастакоў ва ўсе часы была ***тэма прыроды***. Незвычайна прыгожыя краявіды розных куткоў свету адкрываюць нам пейзажы, музычныя і паэтычныя замалёўкі. На палатне «Ручай у лесе (на касагоры)» рускі мастак Іван Іванавіч Шы́шкін паказаў хваёвы бор у летні сонечны дзень. Шматгадовыя сосны са стройнымі ствала мі цягнуцца да сонца. Зялёная трава і мох, нібы коўдра, ахутваюць лясныя ўзгоркі, ля падножжа якіх цурчыць ручай. У яго крышталёва чыстай вадзе адлюстроўваюцца праблескі неба, якое праступае скрозь кроны дрэў. Сонечнае святло азарае ўзлесак дзесьці ўдалечыні, прапануючы гледачу паблукаць па лесе, атрымаць асалоду ад гучання прыроды.

**Ф. Мендэльсо́н.** Цыкл «Песні без слоў» (№ 1, опус 30)
**Ф. Шапэ́н.** Эцюд до мінор (№ 12, опус 25)

**А. А. Анікé йчык.** Мінчанка
Імператар Аўгуст. Статуя з Пры́ма По́рта

І ўсё ж цэнтральным вобразам мастацкіх твораў быў і застаецца ***чалавек*** — яго аблічча, унутраны свет, учынкі. Часцей за ўсё чалавек паўстае перад намі ў выглядзе супакоенай прыгажуні ці адважнага героя, надзеленага незвычайнай сілай. Італьянскі мастак Рафаэ́ль стварыў вобраз ласкавай, клапатлівай маці, якая засцерагае сына ад


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

магчымых нягод. У карціне «Мадонна са шчыглом» вобраз Божай Маці сугучны навакольнаму пейзажу. Яе позірк адухоўлены і паэтычны. Мадонна пяшчотна абдымае немаўля Іаана Хрысціцеля, які перадае Хрысту птушаня.

У невялікіх музычных мініяцюрах цыкла «Песні без слоў» нямецкі кампазітар Фе́лікс Мендэльсо́н Барто́льдзі раскрывае і разнастайнасць навакольнага свету, і розныя адценні ўнутранага стану чалавека. Музыка з дапамогай толькі ёй уласцівых сродкаў выразнасці аб’ядноўвае ў сабе шматлікія тэмы: гісторыі, прыроды, чалавека.



**Рафаэль.**
Мадонна са шчыглом

Мастацтву падуладныя любыя тэмы і сюжэты. Пры гэтым на працягу многіх стагоддзяў нязменна важнымі застаюцца тэмы гісторыі, прыроды, чалавека. Такія тэмы ў мастацтве называюць вечнымі.

### Пытанні і заданні

1. Якія тэмы ў мастацтве называюць вечнымі? Праілюструйце свой адказ мастацкімі прыкладамі, прадстаўленымі ў параграфе.

2. З творамі якіх відаў мастацтва вы сустракаецеся кожны дзень? Якім тэмам мастацтва яны адпавядаюць? Ахарактарызуйце адну з іх.

### Творчая майстэрня

3. Падрыхтуйце вуснае сачыненне «Мая любімая тэма ў мастацтве». Праілюструйце сачыненне мастацкімі прыкладамі.

Азнаёмцеся з літаратурнай старонкай на кампакт-дыску. Выканайце заданні.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# Раздзел 1
# Мастацтва пра мастацтва

...Адзіная прыгажосць — гэта праўда,
якая становіцца бачнай.

*Агю́ст Радэ́н*



**Зура́б Цэрэтэ́лі.** Вялікія майстры (г. Масква, Расія) (злева направа: Марк Шага́л, Анры́ Маці́с, Амедэ́а Мадзілья́ні, Па́бла Піка́са, Вінсэнт Ван Гог)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

*Свет мастацтва дзівосны і разнастайны. Ён расказвае нам пра яркія і значныя падзеі ў жыцці грамадства, распавядае пра тое, як раслі гарады, змяняліся ўяўленні чалавека пра прыгажосць, узбагачаліся веды пра ўладкаванне Сусвету, здзяйсняліся навуковыя адкрыцці.*

*Сустракаючыся з творам мастацтва, мы эмацыянальна ацэньваем яго — прыгожы ён ці брыдкі, выклікае захапленне ці абыякавасць. Тым не менш зразумець глыбінны сэнс мастацкага твора, ацаніць у ім усё, што на першы погляд здавалася незаўважным і непрывабным, можа толькі той, хто валодае ведамі і вопытам зносін з мастацтвам.*

## § 2. Жанрава-відавая разнастайнасць мастацтва

У мастацкіх творах перад намі паўстаюць непаўторныя вобразы, пануе незвычайная атмасфера. Мастакі адлюстроўваюць тое, што адбываецца ў рэальным свеце, і тое, чаго не можа быць у рэчаіснасці.

Усе творы мастацтва з'яўляюцца вынікам мастацкай творчасці чалавека. Кожны твор адносіцца да пэўнай вобласці мастацкай творчасці — *віду мастацтва*.

Усе віды мастацтва маюць свае адрозненні. Галоўная асаблівасць кожнага з іх заключаецца ў тым, *як* перададзены мастацкі вобраз — у прасторы, у часе ці ў прасторы і часе адначасова.

Да ***прасторавых відаў мастацтва*** адносяць архітэктуру, выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Гэтыя віды мастацтва таксама называюць *пластычнымі*, паколькі вобразы перадаюцца ў аб'ёме,

**Маста́цтва** — спосаб, форма і вынік адлюстравання і ператварэння рэчаіснасці ў мастацкіх вобразах.

**Від мастацтва** — своеасаблівая форма творчай дзейнасці, у якой выкарыстоўваюцца пэўныя сродкі выразнасці.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Віды мастацтва**

| **Прастора́выя:** | **Ча́савыя:** | **Прастора-ча́савыя:** |
| --- | --- | --- |
| ▪ архітэктура; ▪ выяўленчае мастацтва; ▪ дэкаратыўна-прыкладное мастацтва | ▪ музыка; ▪ літаратура | ▪ танец; ▪ *тэатр;* ▪ *цырк;* ▪ *кіно* |

нібы прадметы, вылепленыя з пластычных матэрыялаў. Творы ці тое, што ў іх увасоблена, маюць тры вымярэнні — вышыню, шырыню, глыбіню. А прастора, у якой гэтыя творы існуюць, можа быць рэальнай ці віртуальнай.

Рымскі акведук каля г. Нім (Францыя)

Камянецкая вежа (Беларусь)

*Архітэктура* прадстаўлена будынкамі, збудаваннямі, а таксама іх комплексамі. Архітэктурныя збудаванні не толькі ўражваюць сваімі вытанчанымі ці простымі маштабнымі формамі, але і ствараюць умовы для камфортнай жыццядзейнасці чалавека.



Палацава-паркавы комплекс «Цві́нгер» (г. Дрэздэн, Германія)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Выяўленчае мастацтва аб'ядноўвае ў сабе жывапіс, графіку і скульптуру. У *жывапісе* з дапамогай фарбаў, нанесеных на якую-небудзь паверхню, узнаўляецца рэальная ці фантастычная атмасфера тых імгненняў, якія застаюцца ў памяці людзей на стагоддзі.

Асновай твораў *графікі* з'яўляецца малюнак. З дапамогай ліній і штрыхоў мастак стварае цікавы вобраз.

У *скульптуры* асноўным спосабам стварэння аб'ёмнай выявы выступае пластычная прапрацоўка матэрыялу.

Прадметы *дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва*, гэтак жа як і творы скульптуры, трохмерныя. Можна не толькі дакрануцца да іх, але і разгледзець іх з розных бакоў.

А вось мастацкія вобразы, увасобленыя ў творах ***ча́савых відаў мастацтва*** — музыкі, літаратуры, — мы не маем магчымасці ўбачыць і не можам дакрануцца да іх. У *музыцы* паслядоўнасць і ўзаемаадносіны гукаў, разнастайнасць рытмаў ствараюць пэўны настрой. У *літаратуры* з дапамогай слова раскрываюцца вобразы, характарызуюцца абставіны, у якіх адбываецца якое-небудзь дзеянне. І ў музыцы, і ў літаратуры мы можам адчуць развіццё мелодыі ці падзеі, якія разгортваюцца ў часе.

У творах ***прасторава-ча́савых відаў мастацтва*** дзеянне адбываецца ў часе і ў прасторы адначасова. Напрыклад, у *танцы* выканаўцы рухаюцца пад музыку, акрэсліваючы прастору нумара, які яны выконваюць. Змена рухаў танцораў адбываецца ў часе,



**Адрыя́н ван О́стадэ.**
Майстэрня мастака.
Аўтапартрэт



**Анры́ дэ Тулу́з-Латрэ́к.**
Спявачка Іве́т Гільбе́р



Пружанская кераміка

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Ры́чард МакДо́нальд.**
Балет

**Жанр** — адна з характарыстак мастацкага твора, якая вызначае яго сюжэт і спецыфіку.



**Канстанцін Селіха́наў.**
Муза оперы
(г. Мінск, Беларусь)

а сцэна ці пляцоўка, на якой разыгрываецца прадстаўленне, вызначае межы прасторы. Асновай стварэння мастацкіх вобразаў у харэаграфічным мастацтве з'яўляюцца рухі і позы танцораў.

Больш дакладную характарыстыку мастацкага твора дае *жанр*. На жанры падзяляецца большасць відаў мастацтва, хоць некаторыя віды, напрыклад архітэктура, такога дзялення не маюць.

Вялікай разнастайнасцю жанраў адрозніваецца *выяўленчае мастацтва*. У жывапісе жанр вызначаюць на аснове таго, *што* мастак малюе. Напрыклад, у *партрэце* мастак паказвае аднаго ці некалькіх людзей, характарызуючы іх знешняе аблічча, эмацыянальны стан, род заняткаў. *Нацюрморт* адлюстроўвае неадушаўлёныя прадметы: кветкі, дзічыну, плады і інш. У *пейзажы* ўвасабляюцца вобразы прыроды. У творах *анімалістычнага жанру* адлюстроўваюцца вобразы жывёльнага свету. У *гістарычным жанры* ў цэнтры ўвагі мастака — падзеі мінулага і сучаснасці.

Мастацкія творы адносяцца да пэўных відаў і жанраў мастацтва. Разуменне жанрава-відавых асаблівасцей дапаможа арыентавацца і разбірацца ва ўсёй разнастайнасці мастацтва.


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Пытанні і заданні**

Пералічыце асноўныя віды мастацтва. Назавіце жанры выяўленчага мастацтва. Праілюструйце свой адказ творамі, прадстаўленымі ў параграфе і на кампакт-дыску.

1. Успомніце мастацкія творы, разгледжаныя на ўроках у мінулым навучальным годзе. Назавіце віды мастацтва, да якіх гэтыя творы адносяцца.

Праслухайце на кампакт-дыску музычны твор А. П. Барадзіна «Палавецкія пляскі» і ў інфармацыйных крыніцах раманс А. А. Аля́б'ева «Жабрачка». Ахарактарызуйце іх. Да якіх музычных жанраў адносяцца праслуханыя творы?

**Творчая майстэрня**

2. Выканайце эскіз эмблемы аднаго з відаў мастацтва.

**Р. Бёрнс.** Верш «Сумленная беднасць»

**А. П. Барадзі́н.** Опера «Князь Ігар» («Палавецкія пляскі»)

## § 3. Сродкі мастацкай выразнасці

Натхненне мастака — галоўны штуршок да стварэння твора мастацтва. Менавіта натхненне ляжыць у аснове нараджэння вобразаў, задум, кампазіцый будучых твораў. А вось рэалізаваць задуманае аўтару дапамагаюць сродкі мастацкай выразнасці.

**Сро́дкі маста́цкай выра́знасці** —
гэта інструменты, якія дазваляюць мастаку дасягнуць жаданага выніку ва ўвасабленні творчай задумы.

У стварэнні *жывапісных твораў* галоўным сродкам выразнасці з'яўляецца *колер*. Галандскі мастак 17 стагоддзя Рэ́мбрант прымяняе стрыманыя колеры, плаўныя танальныя пераходы. Цёплая колеравая гама карцін дазваляе перадаць атмасферу ўтульнасці. Цёмны *каларыт* жывапіснага палатна падкрэслівае дакладнасць адлюстравання таго часу.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Рэмбрант.**
Мастак у майстэрні

Французскі мастак 20 стагоддзя Анры́ Маці́с у кампазіцыі «Танец», наадварот, выкарыстоўвае яркія, кідкія фарбы. Дзякуючы кантрасным колеравым спалучэнням на палатне ўзнікаюць графічна акрэсленыя сілуэты танцораў. Кружачыся ў карагодзе, яны ледзь дакранаюцца да зямлі, быццам лунаюць у нябёсах. Аранжава-чырвоныя фігуры перадаюць фізічную і эмацыянальную напружанасць.

Непаўторныя маляўнічыя кампазіцыі стварае і другі мастак 20 стагоддзя — Васіль Васільевіч Кандзі́нскі. З дапамогай яркіх колеравых плям, графічных ліній і геаметрычных фігур майстар перадае глыбіню прасторы. У кампазіцыі выкарыстоўваецца шырокая колеравая палітра, але дамінуюць усяго некалькі колераў.

У *графіцы* на першы план выступае *малюнак*. З дапамогай контурных ліній мастак прарысоўвае фігуры. Штрыхі дапамагаюць прапрацаваць дэталі, стварыць аб'ём малюнка і святлоценявыя эфекты. Нават у малюнках, якія не адпавядаюць нашым уяўленням пра рэальнасць, мастак карыстаецца тымі інструментамі, якія ўласцівыя



**Анры Маціс.**
Пано «Танец»



**Васіль Кандзінскі.**
Жоўта-чырвона-сіняе



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

графіцы. Ілюзія скажэння фігуры добра перададзена іспанскім мастаком 20 стагоддзя Пáбла Пікáса ў графічным «Аўтапартрэце».



**Пабла Пікаса.** Аўтапартрэт

**С. Батычэ́лі.** Мадонна дэль Магніфікáт

Галоўным сродкам выразнасці ў *скульптуры* з'яўляецца *аб'ёмная мадэліроўка*, гэта значыць прапрацоўка мадэлі ў аб'ёме. У залежнасці ад уласцівасцей матэрыялу скульптар выкарыстоўвае розныя спосабы яго апрацоўкі. Напрыклад, для дрэва — разьбу, для металу і каменю — высяканне, для гіпсу і гліны — лепку.

Часам пластычныя вобразы настолькі рэальныя, што складана ўявіць, якімі сродкамі мастаку ўдалося іх стварыць. Гледзячы на скульптурную кампазіцыю італьянскага майстра 19 стагоддзя Рафаэ́ля Мóнці «Мармуровая вуаль», мы міжволі задумваемся, ці сапраўды гэта работа выканана з мармуру. Ці можна настолькі рэалістычна перадаць у камені празрыстасць і лёгкасць тканіны?

У *архітэктуры* адным з галоўных сродкаў мастацкай выразнасці з'яўляецца *аб'ёмна-прасторавая кампазіцыя*. Спалучэнне



**Рафаэль Монці.** Мармуровая вуаль



Храм Ая-Соф'я (г. Стамбул, Турцыя)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Палац Пуслоўскіх (г. Ко́сава, Беларусь)

разнастайных геаметрычных формаў рознага маштабу стварае аснову архітэктурных вобразаў. Сярод іх — і велічныя саборы, і грандыёзныя палацы. Прапарцыянальныя суадносіны формаў і дэталей кампазіцыі дазваляюць архітэктарам перадаць пэўны рытм, які настройвае на ўспрыманне збудавання, задае эмацыянальны тон.

Сярод усіх відаў мастацтва найбольшай разнастайнасцю сродкаў выразнасці вызначаецца *дэкаратыўна-прыкладное*. У ім могуць выкарыстоўвацца сродкі выразнасці, уласцівыя іншым відам мастацтва: жывапісу, скульптуры і нават архітэктуры. У дэкоры такіх твораў важнае месца займае *арнамент*.

Антычны вазапіс

*Музыка* нараджаецца з дапамогай *гукаў*. Пранізлівыя, рэзкія, загадкавыя, пяшчотныя, яны чаргуюцца адзін з адным і ўтвараюць *мелодыю*. У мелодыі ўвасоблены мастацкі вобраз музычнага твора. Магчыма, таму яе часта называюць душой музыкі. Мелодыю можна праспяваць ці выканаць на музычным інструменце. Без *рытму* мелодыі не існуе. Ненадакучлівы рытм надае мелодыі лірычны характар, рэзкі і перарывісты рытм перадае трывожнасць і ўсхваляванасць.



Куфэрак-церамок.
Халмагорская разьба



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

У невялікай музычнай замалёўцы «Шум лесу» венгерскага кампазітара Фе́рэнца Лі́ста на фоне лёгкіх, амаль празрыстых пераліваў у акампанеменце гучыць глыбокая мелодыя. З дапамогай сродкаў музычнай выразнасці аўтар стварыў карціну вясновага лесу. Прагульваючыся разам з кампазітарам, мы прыслухоўваемся да ціхага шэпту лісця, спеву птушак.

Сродкі мастацкай выразнасці дапамагаюць мастаку выказаць свае эмоцыі і думкі, сваё стаўленне да рэчаіснасці. Ведаючы выразныя сродкі розных відаў мастацтва, мы, гледачы і слухачы, лепш разумеем мастака і яго задуму.

### Пытанні і заданні

1. Уважліва разгледзьце выявы архітэктурных збудаванняў, прадстаўленыя ў параграфе. Назавіце і ахарактарызуйце сродкі выразнасці аднаго з іх.

Знайдзіце ў інфармацыйных крыніцах і праслухайце эцюд «Шум лесу» Ф. Ліста і музыку барабанаў групы Magic of Drums. Які эмацыянальны водгук выклікалі ў вас гэтыя творы? Які з твораў створаны сучасным аўтарам? Чаму вы так вырашылі?

### Творчая майстэрня

Падбярыце на старонках вучэбнага дапаможніка ці ў іншых інфармацыйных крыніцах творы розных відаў мастацтва. Складзіце вуснае апавяданне-характарыстыку аднаго з іх, вылучыўшы асноўны сродак мастацкай выразнасці (колер, рытм, форму, аб'ём і інш.).

## § 4. Вобраз творцы ў мастацтве

Кожны мастак — творца. Творцам называюць чалавека, які стварае ўнікальныя творы мастацтва. Гледачы і слухачы захапляюцца шэдэўрамі дойлідаў, скульптараў, кампазітараў, атрымліваюць асалоду ад іх. Магчыма, менавіта таму вобразу творцы прысвечана нямала твораў. Сюжэтам многіх з іх з'яўляюцца цудоўныя і непаўторныя

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

моманты нараджэння твора мастацтва. У гэтых момантах выяўляецца стаўленне майстра да сваёй работы.

**Маста́цкая тво́рчасць** — від дзейнасці чалавека па стварэнні твораў мастацтва.

У поле зроку мастакоў трапляюць паэты, якія застылі ў роздуме над вершаскладаннем, і жывапісцы з пэндзлем і палітрай у руках, што рупліва выпісваюць дэталі кампазіцыі. Ці дойліды, якія разважліва праектуюць збудаванні, кампазітары, што энергічна запісваюць ноты будучай мелодыі, і акцёры, якія віртуозна выконваюць ролі…

У розных відах мастацтва вобраз творцы раскрываецца пароснаму. У выяўленчым мастацтве, адлюстроўваючы майстра за працай, аўтар перадае толькі адно імгненне — тое, якое найбольш дакладна характарызуе творцу. Атрыбуты мастацтва дапаўняюць яго вобраз, дапамагаюць выразіць сферу яго творчасці. У літаратуры, тэатры і кіно вобраз творцы раскрываецца больш разнабакова. У іх майстры паказваюць мастака ў розныя моманты жыцця і творчасці, паступова раскрываючы асаблівасці яго знешняга аблічча і ўнутранага свету.

**Атрыбу́ты мастацтва** — прадметы, нязменна ўласцівыя мастацкай творчасці.



**Пётр Клот.** Помнік І. А. Крылову (г. Санкт-Пецярбург, Расія)

Ствараючы вобраз рускага байкапісца Івана Андрэевіча Крылова, скульптар Пётр Карлавіч Клот нібы выхапіў адзін момант з яго жыцця. У паўсядзённым адзенні майстар сядзіць на лаве з кнігай у руках. Нахмураныя бровы, апушчаныя куткі вуснаў, накіраваны ўдалячынь погляд передаюць унутраную засяроджанасць пісьменніка. Прагульваючыся па алеі, байкапісец прысеў адпачыць. Магчыма, ён задумаўся над сюжэтам новага твора.


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Вытанчанасць і паэтычнасць натуры перададзена ў вобразе рускага кампазітара Пятра Ільіча Чайкоўскага. Такім яго ўвасобіла ў мануменце скульптар Вера Ігнацьеўна Му́хіна. Седзячы ў крэсле і абапіраючыся на пюпітр, на якім ляжыць нотны сшытак, кампазітар дырыжыруе аркестрам. Яго вобраз адухоўлены, поза свабодная і раскаваная. Ён чуе мелодыю і плаўным рухам рукі туру́е гучнаму рытму.



**Вера Мухіна.** Помнік П. І. Чайкоўскаму (г. Масква, Расія)

**Мікела́нджэла.** Музыканты

**М. М. Жу́каў.** Вучаніца балетнага вучылішча

**Г. Метсю́.** Маладая жанчына, якая малюе

Калі ў помніку Пятру Ільічу Чайкоўскаму адлюстраваны якасці асобы кампазітара, то ў вершы «У напевах струн» французскі пісьменнік Віктó р Гюгó характарызуе музыку як від мастацтва. Гучанне музычных інструментаў ён параўноўвае з гукамі навакольнага свету. Пры гэтым кожны інструмент апісваецца з дапамогай яркіх эпітэтаў.

В напевах струн и труб есть радостные тайны,
Люблю в ночном лесу я рога зов случайный,
Люблю орган: он — гром и лира, ночь и блеск,
Он — дрожь и бронза, он — волны безмерной всплеск,
Он — горн гармонии, встающей в туче чёрной;
Люблю я контрабас, что плачется упорно;
И, под трепещущим смычком, люблю душой
Я скрипку страшную: в себя вместив гобой,
Шум леса, аквилон, лёт мушки, систр, фанфары,
Льёт полусвет её мучительные чары...

*Виктор Гюго. В напевах струн*

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Нікала Ланкрэ.**
Партрэт танцоўшчыцы Камарго

На карціне французскага жывапісца 18 стагоддзя Нікала́ Ланкрэ́ «Партрэт танцоўшчыцы Камарго́» перад намі таксама паўстае партрэтны вобраз. Вядомая танцоўшчыца паказана падчас выканання харэаграфічнага нумара. Яе рухі лёгкія і вытанчаныя. Музыканты, якія акружаюць сцэнічную пляцоўку, не адрываюць позірку ад танцоўшчыцы і старанна выконваюць свае партыі.

Галандскі мастак Карнэ́ліс Врэ́дэнбург для таго, каб раскрыць вобраз жывапісца Яна Бе́кера, выкарыстаў яркія фарбы і смелыя, рашучыя мазкі. Партрэтны вобраз з цяжкасцю адгадваецца на карціне. Удалечыні ад людской мітусні мастак застаўся сам-насам з прыродай. Ён захоплены сваёй працай. Насунуўшы капялюш на бровы,

**Плено́р** — работа мастака на адкрытым паветры, у натуральных умовах.



**Карнэліс Врэдэнбург.**
Мастак Ян Бекер за працай



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Ян Бекер хавае твар ад пякучага сонца. Глядач не бачыць, што малюе мастак на палатне: піша пейзаж на пленэры ці выконвае эцюд для будучай сюжэтнай кампазіцыі. Але вясёлкавыя колеры даюць магчымасць адчуць настрой творцы.

**С. Далі́.** Сюррэалістычнае піяніна

**К. Я. Мако́ўскі.** Вандроўныя музыканты



**Марк Шагал.**
Віяланчэліст

Незвычайны, фантастычны вобраз музыканта стварыў на карціне «Віяланчэліст» беларускі мастак Марк Захаравіч Шага́л. На фоне зімовага гарадскога пейзажу ў начной цішыні музыкант выконвае мелодыю. Яго цела прадстаўлена ў форме віяланчэлі. Толькі на ўзроўні плечавога пояса адгадваюцца рысы касцюма: каўнер кашулі, пінжак і гальштук, якія плаўна пераходзяць у абрысы музычнага інструмента. Левая рука, заледзянелая ад холаду, сціскае смычок, які мерна слізгае па струнах. Побач верны сябар — жывёла — падыгрывае на скрыпцы.

Майстры мастацтва ў сваіх работах расказваюць нам пра асаблівасці стварэння мастацкіх кампазіцый. З іх твораў мы даведваемся пра складаны працэс — творчасць.

### Пытанні і заданні

1. Уважліва разгледзьце ілюстрацыі, прадстаўленыя ў параграфе. Якія атрыбуты ў малюнках творцаў даюць падказку пра іх прафесію?

2. Чым, на ваш погляд, адрозніваецца мастацкая творчасць ад іншых сфер дзейнасці чалавека?

### Творчая майстэрня

3. Складзіце вуснае апавяданне пра аднаго з майстроў мастацтва, прадстаўленых у парафрафе. Выкарыстоўвайце для гэтага даведачную літаратуру.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## § 5. Узаемасувязь і ўзаемапранікненне відаў мастацтва

Многія віды мастацтва ўзаемазвязаныя. У адным відзе мастацтва могуць ужывацца прыёмы іншага: у жывапісе — прыёмы музыкі, у тэатральным мастацтве — фатаграфіі ці танца. Такая ўзаемасувязь дазваляе аўтарам больш ярка і эмацыянальна раскрываць вобразы, тэмы, ідэі.

Паступова ўзаемасувязь розных відаў мастацтва стала саступаць месца іх узаемадзеянню. Творцы, рухаючыся наперад у пошуках нязведанага, зацвярджалі новыя формы мастацтва. Гэта прывяло да ўзбагачэння сродкаў мастацкай выразнасці. Ча́савым відам мастацтва (музыцы, літаратуры) стала ўласціва «маляўнічасць», а прасторавыя (выяўленчае, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва і архітэктура) — «загучалі».

Узаемасувязь і ўзаемапранікненне розных відаў мастацкай дзейнасці — архітэктуры, музыкі, харэаграфіі — сталі асновай для стварэння дзівосных прадстаўленняў, у якіх галоўным «дзеючым персанажам» з'яўляецца вада. Спяваючыя фантаны, якія пад музыку ўздымаюцца да нябёсаў, зачароўваюць гледачоў сваім хараством. Струмені вады быццам танцуюць пад класічную і сучасную музыку. Непаўторныя не толькі формы і «гучанне» фантанаў, але і казачна-фантастычныя «карціны», якія ствараюцца струменямі вады і падсветкай.



Кршы́жыкавы фантаны (г. Прага, Чэхія)



**Іосіф Лангба́рд.** Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь (г. Мінск)


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Трыумф гукаў адчуваецца ў мастацкім вобразе будынка Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь. Дынамічныя формы збудавання адлюстроўваюць рытм і палётнасць мелодыі архітэктурнага вобраза. У навакольнай цішыні чуецца гучанне фанфар, пад якія выходзяць на сцэну артысты тэатра. Скульптуры, устаноўленыя на фасадах, дапаўняюць мастацкі вобраз будынка тэатра музычнай сімволікай. Над уваходам узвышаецца скульптурная група з грэчаскім богам Апалонам — заступнікам мастацкай творчасці, які трымае ў руках вянкі. З двух бакоў ад яго — німфы, якія трубяць, услаўляючы мастацтва. Аб'ядноўвае кампазіцыю выкананая ў бронзе стужка з нотным станам.

**Л. Даме́нек-і-Мантане́р.** Інтэр'ер Палаца каталонскай музыкі (г. Барселона, Іспанія)

Пластыка формаў у спалучэнні з «музычнасцю» кампазіцыі атрымала ўвасабленне ў помніку фінскаму кампазітару Яну Сібе́ліусу. Скульптурны твор складаецца з дзвюх на першы погляд самастойных частак, аб'яднаных толькі пастаментам (скалой). Такі арыгінальны прыём дазволіў аўтару стварыць непаўторны мастацкі вобраз. Першая частка кампазіцыі ўяўляе сабой партрэт творцы. Ён, здаецца, складае мелодыю, якая напаўняе прастору парка разнастайнымі гукамі. Другая частка — арган са шматлікіх труб. Пры подыху ветру яны ўтвараюць гукі, якія аддалена нагадваюць фрагменты музычных твораў кампазітара.



**Э́йла Хі́льтунен.** Помнік Я. Сібеліусу (г. Хельсінкі, Фінляндыя)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Антоніа Канова.**
Танцоўшчыца



**Ніна Малышава.**
Статуэтка «Беларускі танец “Лявоніха”»

Пластычная прапрацоўка матэрыялу ў скульптуры дазваляе майстрам ствараць мастацкія вобразы, якія выпраменьваюць пачуцці і эмоцыі. Мармуровая скульптура танцоўшчыцы, якую выканаў італьянскі майстар Анто́ніа Кано́ва, увасабляе грацыю, пластычнасць, далікатнасць. Яе лёгкае паўпразрыстае адзенне, што нагадвае старажытнагрэчаскі хітон, падкрэслівае вытанчанасць рухаў. Выконваючы танцавальную кампазіцыю, артыстка дынамічна рухаецца наперад. Ствараецца ўражанне, быццам яна зараз сыдзе са сцэны да гледача, зачароўваючы яго танцавальнымі рытмамі.

**С. Батычэлі.**
Вясна (фрагмент «Тры грацыі»)

Пластыка — галоўны сродак выразнасці не толькі ў скульптуры, але і ў харэаграфічным мастацтве. Але гэта розная пластыка. У скульптуры з дапамогай пластычнай прапрацоўкі матэрыялу мастак стварае статычныя вобразы, быццам адлюстраваныя на фотаздымку. У танцы пластычныя рухі выканаўцаў нараджаюць дынамічныя вобразы. Танцавальная пластыка здольная перадаць розны характар вобраза, які змяняецца на працягу харэаграфічнай кампазіцыі.

Адчуванне «музычнасці» жывапісных кампазіцый ствараюць не толькі вобразы і сюжэты, прапрацоўка формаў выяўленых мадэляў ці прадметаў, але і каляровая гама, характар мазкоў. У звонкіх фарбах карціны Кло́да Аска́ра Манэ́ «Дама ў садзе Сент-



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Клод Манэ.**
Дама ў садзе Сент-Адрэс

Адрэс» чуюцца пералівы мелодыі лета. Сінія, чырвоныя, жоўтыя, зялёныя колеравыя плямы, нібы раскіданыя па палатне, гарманічна зліваюцца ў меладычны напеў. Сузіраючы прыгажосць прыроды, дама ў белым адзенні запрашае гледача наталіцца музыкай летняй пары.

Узаемасувязь і ўзаемапранікненне розных відаў мастацтва ствараюць умовы для нараджэння новых вобразаў, настрояў, характараў.

### Пытанні і заданні

1. Уважліва разгледзьце малюнкі, прадстаўленыя ў параграфе. Якія пачуцці яны ў вас выклікаюць?

Знайдзіце ў інфармацыйных крыніцах і праслухайце фрагмент сімфанічнай паэмы літоўскага кампазітара М. К. Чурлёніса «У лесе». З якімі відамі мастацтва суадносіцца музычны вобраз? Растлумачце сваё меркаванне.

Прачытайце на кампакт-дыску верш К. Д. Бальмонта «Нараджэнне музыкі». Якую карціну «малюе» паэт у гэтым вершы?

**К. Д. Бальмо́нт.** Верш «Нараджэнне музыкі»

### Творчая майстэрня

Азнаёмцеся з дадатковай старонкай на кампакт-дыску да раздзела «Мастацтва пра мастацтва». Выканайце заданні.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# Раздзел 2
# Дыялогі ў мастацтве

Добра слухаць і добра адказваць — гэта адна з найвялікшых дасканаласцей, якая толькі магчыма ў размове.

*Франсуа́ дэ Ларошфуко́*



Палацава-паркавы ансамбль у г. Нясвіжы (Беларусь)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

*Усе віды мастацтва «размаўляюць» з намі, гледачамі і слухачамі, з дапамогай спецыяльных сродкаў выразнасці: колеру, формы, лініі, мелодыі, рытму і г. д. Але, аказваецца, віды мастацтва могуць весці размову і паміж сабой.*

*Уважліва прыслухоўваючыся адзін да аднаго, віды мастацтва ўзаемна ўзбагачаюцца. У выніку размовы яны чэрпаюць ідэі, запазычваюць новыя мастацкія элементы. Так з'яўляюцца новыя мастацкія напрамкі і нават новыя віды мастацтва.*

*Такім чынам, важным становіцца не толькі ўзаемасувязь і ўзаемапранікненне розных відаў мастацтва, але і іх дыялог.*

## § 6. Дыялог мастацтваў

Найбольш ярка дыялог мастацтваў прадстаўлены ў *садова-паркавым мастацтве*. Вакол сцен Нясвіжскага палаца размяшчаецца цэлы шэраг выразных формаў, утвораных дарожкамі, масткамі і разнастайнымі раслінамі. У выніку пабудовы атрымліваюць новы маляўнічы фон, своеасаблівую раму. Гэта змяняе ўражанне ад архітэктурнага комплексу. Строгія формы палаца змякчаюцца плаўнымі і мудрагелістымі лініямі дрэў. Цёплая колеравая гама сцен палаца ўзбагачаецца фарбамі лістоты і хвоі. Роўнядзь вадаёма, нібы люстэрка, пяшчотна «размывае» і падвойвае гэту прыгажосць.

**Садо́ва-па́ркавае мастацтва** — мастацтва стварэння садоў і паркаў.

Палац і парк аказаліся звязанымі паміж сабой дыялогам мастацтваў. Чалавек падчас дыялогу ўважліва слухае суразмоўцу, адказвае змястоўнымі меркаваннямі і ўзбагачаецца новымі ведамі. Калі ў мастацтве адбываецца дыялог, то ўзнікаюць новыя творы мастацтва.

У дыялогу архітэктара і майстра садова-паркавага мастацтва з'яўляюцца *палацава-паркавыя ансамблі* незвычайнай прыгажосці.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Выразныя сродкі ў іх нібы пераклікаюцца, любуюцца адзін адным і дэманструюць свае лепшыя якасці.

Палацава-паркавы ансамбль «Пецяргоф» (г. Санкт-Пецярбург, Расія)

Палацава-паркавы ансамбль у г. Нясвіжы (Беларусь)

**Дыяло́г** — размова, абмен выказваннямі і думкамі.

Вось, напрыклад, палацава-паркавы ансамбль у горадзе Версалі. Яго пачалі будаваць больш за трыста гадоў таму ў наваколлі Парыжа як загарадную рэзідэнцыю караля Францыі. Вакол палаца раскінуўся велізарны парк. Акрамя дрэў, у парку шмат дэкаратыўных басейнаў, кветнікаў і газонаў. Паглядзіце, якія раскошныя ўзоры ўтвараюць дываны з траў, кустоўя і кветак. Яны падкрэсліваюць веліч палацавай архітэктуры. Некалькі разоў на год садоўнікі перасаджваюць расліны ў кветніках. Тады палац змяняе свой убор.

Скульптура ў садова-паркавым мастацтве таксама ўступае ў размову. Беламармуровыя статуі нібы запрашаюць прагуляцца па версальскіх алеях. А бог мораў Нептун, выкананы ў бронзе, выязджае з воднай гладзі на калясніцы, запрэжанай чароўнымі коньмі.

У Расіі, у наваколлі горада Санкт-Пецярбурга, створаны палацава-паркавы ансамбль «Пецяргоф». У ім, як і ў палацава-паркавым





Палацава-паркавы ансамбль «Версаль» (Францыя)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Палацава-паркавы ансамбль «Пецяргоф» (г. Санкт-Пецярбург, Расія)

ансамблі «Версаль», раскоша дэкору палацавых сцен пераклікаецца з зелянінай, кветкамі і вадой. У люстэрку водных басейнаў адлюстроўваюцца і прырода, і архітэктура. А фантаны струменямі вады «малююць» дзівосныя ўзоры, якія нагадваюць вежы і піраміды.

Штогод, вясной, тут праводзіцца ўрачыстае адкрыццё фантанаў. Наведвальнікі з задавальненнем удзельнічаюць у святочным прадстаўленні, падчас якога ў дыялог уступаюць архітэктура, скульптура, музыка фантанаў, феерверкі.

Актыўную «размову» вядуць мастацтвы на розных фестывалях. Напрыклад, у горадзе Маладзечне праводзіцца Нацыянальны

**Феерве́рк** — светлавое прадстаўленне, якое ладзяць з дапамогай спецыяльнай тэхнікі.



Выступленне шоу-тэатра «Хвілінка» на «Славянскім базары ў Віцебску», 2016 (кіраўнік Яўген Фамба́раў, мастацкі кіраўнік Таццяна Панова)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне





Дыялог мастацтваў на «Славянскім базары ў Віцебску»

фестываль беларускай песні і паэзіі. Выступленні артыстаў, змяняючы адно аднаго, ствараюць дыялог літаратуры і музыкі.

На фестывалі «Славянскі базар у Віцебску» ў «размову» ўступаюць музыка, харэаграфія, выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.

У 2007 годзе Маскоўская дзяржаўная акадэмічная філармонія арганізавала своеасаблівую форму дыялогу мастацтваў — цыкл «Казкі з аркестрам». У літаратурна-музычных кампазіцыях артысты тэатра і кіно чытаюць любімыя дзіцячыя творы ў суправаджэнні сімфанічнага аркестра. Дырыжор аркестра не проста стварае музычны фон. Ён уважліва прыслухоўваецца да кожнага слова акцёра, каб своечасова падхапіць інтанацыю, узмацніць яе ці, наадварот, аслабіць. Такі дыялог мастацкага слова і музыкі пашырае прастору казкі.

**Фестыва́ль** — масавае свята, паказ дасягненняў розных відаў мастацтва.



Сцэна з літаратурна-музычнай кампазіцыі «Пунсовая кветачка» (цыкл «Казкі з аркестрам»). Чытае Кацярына Гусева



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Ва ўяўленні ўзнікаюць новыя вобразы. Музыка дапаўняе іх, выклікаючы ў слухача глыбокі эмацыянальны водгук.

Уменне весці дыялог — вялікае дасягненне. «Размаўляючы» адзін з адным, віды мастацтва раскрываюць свае грані і адценні, дэманструючы гледачам і слухачам новыя арыгінальныя фарбы, лініі, формы.

### Пытанні і заданні

Уважліва разгледзьце выявы палацава-паркавых комплексаў, прадстаўленыя ў параграфе і на кампакт-дыску. Выразныя сродкі якіх відаў мастацтва ствараюць іх непаўторнае аблічча?

1. Якія фестывалі мастацтваў вы ведаеце? На якім фестывалі вам хацелася б пабываць? Дыялог якіх мастацтваў вам было б цікава арганізаваць?

### Творчая майстэрня

Знайдзіце ў інфармацыйных крыніцах і паслухайце адну з праграм цыкла «Казкі з аркестрам». Складзіце вуснае апавяданне на тэму «Незвычайны канцэрт». Пры падрыхтоўцы апавядання адкажыце на пытанні: Якую казку дэкламуе артыст? Музыку якіх кампазітараў выконвае аркестр? Што новае, незвычайнае ўдалося ўявіць і адчуць падчас праслухоўвання?

## § 7. Садружнасць мастацтваў

Віды мастацтва ўзбагачаюць і дапаўняюць адзін аднаго з дапамогай сродкаў мастацкай выразнасці, аб’ядноўваюцца ў зусім новыя ўнікальныя садружнасці. Злучэнне сродкаў выразнасці і мастацкіх прыёмаў, уласцівых розным відам мастацтва, нараджае новыя вобразы, непаўторныя формы і віды мастацкай творчасці.



Клоўн — цэнтральная фігура цыркавога прадстаўлення

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Асабліва прыкметна гэта ў цырку. Мы чуем бравурную музыку, бачым яркія фантастычныя касцюмы выканаўцаў. Па арэне струменяцца стужкамі рознакаляровыя агні пражэктараў. Цыркавыя артысты выконваюць на дзіва складаныя і небяспечныя трукі, а клоўны напаўняюць сцэну цырка звонкім смехам і неверагоднай весялосцю. Вядома, можна і дома праслухаць цыркавы марш, разгледзець фатаграфіі прадстаўлення. Але гэтае ўражанне немагчыма параўнаць з тым, калі ўсе фарбы, усе выразныя сродкі розных мастацтваў зліваюцца разам у цыркавой дзеі.

Садружнасць розных відаў творчасці ярка ўвасабляюць *сінтэтычныя* віды мастацтва. У іх элементы розных мастацтваў не проста суседнічаюць, а дапаўняюць адзін аднаго. У сінтэтычных відах мастацтва складана вылучыць асобныя элементы. Кожны элемент цікавы як частка цэлага. Да сінтэтычных відаў мастацтва адносяцца танец, тэатр, цырк, кіно. У 20 стагоддзі да іх далучылася камп'ютарнае мастацтва.

**Сінтэты́чныя віды мастацтва** — віды мастацкай творчасці, у якіх арганічна злучаюцца сродкі выразнасці розных відаў мастацтва.

Беларускі скульптар Сяргей Афанасьевіч Бандарэ́нка стварыў фігуры, якія ўпрыгожваюць пляцоўку перад Беларускім дзяржаўным цыркам. Майстар перадаў незвычайнасць касцюмаў і музычных





**Сяргей Бандарэнка.**
Скульптуры каля Беларускага дзяржаўнага цырка (г. Мінск, Беларусь)


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

інструментаў, загадкавасць фокусаў і адвагу гімнастаў. Але ўсе гэтыя скульптуры — толькі запрашэнне да цыркавога прадстаўлення. На круглай арэне ў садружнасці розных відаў мастацтва вось-вось з'явіцца сапраўдны цырк!

Нярэдка сінтэтычныя віды мастацтва «цікавяцца» адзін адным. Напрыклад, з кінастужак мы даведваемся пра тэатр, а з тэлеперадач — пра кіно.

Выдатны майстар савецкай анімацыі Фёдар Савельевіч Хітру́к стварыў мультфільм «Канікулы Баніфа́цыя». Яго галоўны герой — цыркавы артыст леў Баніфацый — прыязджае на канікулы да бабулі. Але ў гасцях ён не стрымліваецца і дэманструе сваё майстэрства. Аказваецца, лепшае з таго, што ёсць у цырку, можна прывезці з сабой!



Кадр з анімацыйнага фільма «Канікулы Баніфацыя» (рэжысёр Фёдар Хітрук)

Часта цыркавыя артысты выступаюць у касцюмах усходняга стылю: на іх атласныя шаравары, халаты, чалма[1]. Гэта звязана з тым, што многія цыркавыя трукі нарадзіліся на Усходзе. Усходняе адзенне выглядае незвычайна і загадкава, нібы настройвае на чаканне чараўніцтва.

Тэма Усходу ўвасоблена ў творах розных відаў мастацтва. Пісьменнікаў прыцягваюць нязвыклыя для еўрапейцаў парадкі і традыцыі народаў усходніх краін. Мастакоў — маляўнічасць убораў і экзатычная прырода. Самабытныя сюжэты арабскіх казак абудзілі фантазію многіх дзеячаў мастацкай культуры. Сярод іх — рускі мастак Іван Якаўлевіч Білі́бін.



**Іван Білібін.** Ілюстрацыя да казкі «Дыван-самалёт»

[1] Чалма́ — мужчынскі галаўны ўбор, які складаецца з палатна лёгкай тканіны, абкручанай вакол галавы.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Ён маляўніча праілюстраваў усходнюю казку «Дыван-самалёт». На старонках кнігі ў садружнасць уступаюць літаратура і выяўленчае мастацтва.

Казку «Алі-Баба і сорак разбойнікаў» ярка і займальна распавядае Веніямі́н Барысавіч Сме́хаў. У тэлевізійным спектаклі ўсе персанажы спяваюць. Кожнага героя характарызуе не толькі яркі касцюм, але і мелодыя з усходнімі матывамі. Аўтар вядзе апавяданне ад імя Мустафы. Ён настройвае гледача на сустрэчу з героямі п'есы. У садружнасць мастацтваў уступаюць акцёрскае майстэрства, мастацкае слова і музыка.



Сцэна з музычнага тэлеспектакля «Алі-Баба і сорак разбойнікаў» (рэжысёр Алег Рабаконь). Ролю апавядальніка Мустафы выконвае Веніямін Смехаў

Адзін з самых знакамітых спектакляў Дзяржаўнага акадэмічнага цэнтральнага тэатра лялек імя С. У. Абразцова — «Чароўная лямпа Аладзіна». Усходні каларыт у пастаноўцы падкрэсліваецца грацыёзнымі рухамі лялек, дэкарацыямі і музыкай. Фігура грознага джына Кашка́ша засланіла пустэльны пейзаж і горад з раскошнымі залатымі палацамі. На гэтым фоне Аладзін выглядае



Сцэна са спектакля «Чароўная лямпа Аладзіна». Дзяржаўны акадэмічны цэнтральны тэатр лялек імя С. У. Абразцова (г. Масква, Расія)



Кадр з фільма «Чароўная лямпа Аладзіна» (рэжысёр Барыс Рыцараў). Цэнтральная кінастудыя імя Максіма Горкага



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

безабаронным. У той жа час эпізод падкрэслівае адвагу і рашучасць юнака. Пазней ён не пабаіцца ўступіць у барацьбу з вераломным і сквапным візірам.

Яркія ўсходнія вобразы сустракаюцца і ў мастацкім фільме «Чароўная лямпа Аладзіна» рэжысёра Барыса Уладзіміравіча Ры́царава. Джын, зняволены ў чароўнай лямпе, прадстаўлены як мультыплікацыйны вобраз. Да выразных сродкаў літаратуры, выяўленчага і музычнага мастацтва, акцёрскага майстэрства далучаюцца выразныя сродкі мастацтва анімацыі — «ажыўлення» персанажаў.

Сінтэз мастацтваў — не проста выкарыстанне сродкаў выразнасці розных відаў мастацтва. Гэта іх арганічнае злучэнне, дзякуючы якому ўзмацняецца эмацыянальнае ўздзеянне твора на гледача і слухача.

### Пытанні і заданні

Паглядзіце ў інфармацыйных крыніцах анімацыйны фільм Ф. С. Хітрука «Канікулы Баніфацыя». Якія цыркавыя трукі супадаюць з трукамі, узноўленымі ў скульптурнай кампазіцыі С. А. Бандарэнкі?

Прачытайце на кампакт-дыску казку «Алі-Баба і сорак разбойнікаў». Паглядзіце ў інфармацыйных крыніцах фрагменты спектакля і фільма. Якія фрагменты казкі могуць паслужыць сюжэтам для цыркавога прадстаўлення? Якія нумары маглі б выканаць яе героі?

Казка «Алі-Баба і сорак разбойнікаў»

### Творчая майстэрня

1. Выканайце каляровую ілюстрацыю да адной з казак, прадстаўленых у параграфе. Прыдумайце для ілюстрацыі выразную назву.

Азнаёмцеся з дадатковымі старонкамі на кампакт-дыску да раздзела «Дыялогі ў мастацтве». Выканайце заданні.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Раздзел 3
# Міфалогія ў мастацтве

Міф, у якой бы форме ён ні перадаваўся, заўсёды ёсць паэзія.

*Ёхан Хёйзінга*



Зеўс Алімпійскі. Рымская копія статуі Фíдыя

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

*Зеўс і Пасейдóн, Арфéй і Эўрыдыíка, Афрадыíта і Афíна, Пярýн, Ярыíла і Лáда... Многія міфалагічныя персанажы з'яўляюцца героямі твораў розных відаў мастацтва. Іх вобразы прываблівалюць творцаў і сёння.*

*Чаму цікавасць да міфалагічных вобразаў ніколі не згасае? Чаму сучасны чалавек так настойліва звяртаецца да набыткаў мінулага?*

*Міфалагічныя сюжэты дапамагаюць нам адказаць на важныя пытанні: што такое каханне, шчасце, дабро? Міфы распавядаюць пра вечныя чалавечыя каштоўнасці. З іх мы бяром ідэі і вобразы. Сюжэты міфаў — невычэрпная крыніца для мастацкай творчасці.*

## § 8–9. Міфалогія як сістэма ўяўленняў чалавека пра свет

Як уладкаваны свет? Хто стварыў чалавека? Што з'яўляецца крыніцай жыцця на Зямлі? Ужо ў глыбокай старажытнасці людзі шукалі адказы на гэтыя пытанні. Адчуваючы бездапаможнасць перад тым, што адбываецца, яны звязвалі свае тлумачэнні з чароўнымі сіламі. Сонца, Месяц, вада, агонь, святло, усе незразумелыя з'явы навакольнага свету станавіліся адушаўлёнымі, абагаўляліся і надзяляліся імёнамі.

**Міф** — паданне, якое перадае ўяўленні людзей пра свет і чалавека, пра багоў і герояў.

Пра старажытных багоў мы даведваемся з *міфаў* і *легенд*, якія людзі стварылі тысячы гадоў таму. У антычных міфах мы сустракаемся з Зеўсам — богам неба, маланкі і грому. Брат Зеўса, Пасейдон, — уладар мораў і акіянаў. Бог агню Гефéст лічыцца майстрам на ўсе рукі. Бог Апалóн увасабляе святло. У славянскай міфалогіі нам сустракаюцца бог грому і маланкі Пярун, заступніца сям'і і шлюбу багіня Лада, багіня ўрадлівасці і добрага ўраджаю Мóкаш.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Апавядаючы пра старажытных багоў, чалавек спрабаваў пранікнуць у таямніцы прыроднага свету, зразумець найважнейшыя праблемы жыцця. Магчыма, менавіта таму міфалагічныя багі так падобныя на людзей. Яны валодаюць многімі чалавечымі якасцямі: дабрынёй, высакароднасцю, велікадушнасцю ці жорсткасцю, дзёрзкасцю і зменлівасцю.


Зеўс з маланкай і арлом. Фрагмент роспісу старажытнагрэчаскай вазы

Кожны народ складаў *свае* міфы і легенды. Асаблівую папулярнасць у мастацкай культуры атрымалі міфы антычнага свету.

У старажытнагрэчаскім міфе пра Зеўса апавядаецца пра яго ўзыходжанне на святую гару Алімп, дзе жылі галоўныя багі. Як вярхоўны бог Алімпу, бацька ўсіх багоў і людзей, Зеўс утрымлівае раўнавагу паміж дабром і злом, выбачае ці карае тых, хто правініўся.

З Алімпу рассылае людзям Зеўс свае дары і сцвярджае на зямлі парадак і законы. У руках Зеўса лёс людзей; шчасце і няшчасце, дабро і зло, жыццё і смерць — усё ў яго руках. Дзве вялікія пасудзіны стаяць ля варот палаца Зеўса. У адной пасудзіне дары дабра, у другой — зла. Зеўс чэрпае ў іх дабро і зло і пасылае людзям. Гора таму чалавеку, якому грамавержац чэрпае дары толькі з пасудзіны са злом. Гора і таму, хто парушае ўстаноўлены Зеўсам парадак на зямлі і не выконвае яго законаў.

*М. А. Кун. Легенды і міфы Старажытнай Грэцыі (Алімп)*

Гіганцкая статуя Зеўса калісьці ўпрыгожвала адзін з галоўных храмаў Алімпіі. Атлетычна складзены бог, заступнік Алімпійскіх гульняў, велічна сядзіць на троне. Ён справядлівы і высакародны, грозны і літасцівы. Зеўс засяроджаны на спаборніцтвах. У адной руцэ


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

ён трымае статуэтку багіні Нікі, якая ўвасабляе перамогу. У другой — скіпетр, які сімвалізуе ўладу. Ля падножжа статуі — арол, знак сілы і магутнасці вярхоўнага бога.

У антычных багоў, як і ў людзей, былі ўласныя дзеці. Дзяцей багоў і смяротных людзей — паўбагоў — называлі *героямі*. Адзін з самых знакамітых — герой Гера́кл, сын Зеўса і зямной жанчыны. Ён атрымаў вядомасць дзякуючы дванаццаці здзейсненым подзвігам, якія ўвасоблены шматлікімі мастакамі ў творах розных відаў мастацтва.

Геракл паступіў на службу да свайго стрыечнага брата Эўрысфе́я. З нянавісці Эўрысфей пачаў даваць Гераклу смяротна небяспечныя даручэнні. Адным з першых стала распараджэнне знішчыць ільва жахлівай сілы, які жыў каля храма Зеўса ў Неме́і. Немейскі леў у тыя часы лічыўся непаражальным: у яго была настолькі тоўстая шкура, што яе нельга было прабіць ніякай зброяй. Бітва з Немейскім ільвом стала першым подзвігам Геракла.



Бітва з Немейскім ільвом. Фрагмент старажытнагрэчаскага роспісу

...Убачыўшы суперніка, які прысеў для знішчальнага скачка, ён схапіў свой лук і пусціў у яго самай вострай са сваіх стрэл. Але Эўрысфей меў рацыю: Немейскі леў быў непаражальны. Ён скокнуў; але Геракл спрытна ўхіліўся ўбок і, падняўшы сваю булаву, апусціў яе з усяе моцы на галаву ворага. І булава бездапаможна адскочыла; усё ж леў адчуў боль і, адмовіўшыся ад далейшага бою, стаў павольна адыходзіць.

Але Геракл дагнаў ільва і, схапіўшы яго сваімі магутнымі рукамі, стаў яму душыць горла. Колькі ні кідаўся Немейскі леў — Геракл моцна трымаў яго ў сваіх жалезных абдымках і не выпускаў датуль, пакуль той не развітаўся з жыццём.

*Ф. Зялінскі. Казачная старажытнасць*

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Першы подзвіг Геракла падрабязна апісаны ў кнізе сучаснага беларускага пісьменніка Пятра Васільевіча Васючэ́нкі «Дванаццаць подзвігаў Геракла».

...Цела Геракла, якое здавалася абмяклым, раптам узбугрылася вузламі цягліцаў ды жылаў. Дзве рукі злучыліся на горле жывёлы. Цела монстра, недасягальнае для стрэлаў, раптам скукожылася, паддалося жалезнаму хапуну магутных рук. Жывёліна ўжо не магла рыкаць, з пашчы пацякла крывавая пена. І раптам Геракл адчуў пад пальцамі нешта слізкае, выгінастае. Леў ператварыўся ў змяю, вялізнага ўдава з поўнымі злосці вачыма і сіпячай пашчай.

Але хапун Геракла не слабеў. Жоўты агонь, якім свяціліся злосныя вочы ўдава, стаў паступова згасаць. Аднак, перш чым спруцянець, пярэварацень яшчэ некалькі разоў змяняў аблічча, ператвараўся то ў чалавека, то ў вялізнага сабаку. У ім паўтараліся вусцішныя рысы яго продкаў — абрыдлівых монстраў, спароджаных калісьці Геяй...

...Волат, апрануты ў ільвіную шкуру, быў увесь спаласаваны крывавымі пісягамі, слядамі львіных зубоў ды кіпцяў, асобныя раны яшчэ крывавілі. Але голас быў вясёлым — голас пераможцы.

*П. В. Васючэнка. Дванаццаць подзвігаў Геракла*



Геракл і Немейскі леў.
Рымская копія статуі Лісіпа

У кампазіцыі старажытнагрэчаскага скульптара Лісі́па таксама паказана перамога Геракла над Немейскім ільвом. Магутны герой адолеў ільва голымі рукамі, ператварыўшы здабытую шкуру ў свой шлем і плашч.

У скульптуры мы бачым, як напружана цела Геракла. Яго мускулістыя рукі сціскаюць шыю цара звяроў. Скульптар паказаў героя ў руху. Каб праўдзіва перадаць сцэну цяжкай барацьбы, Лісіп паказаў Геракла з невялікім паваротам тулава і нахіленай наперад галавой.

У славянскай міфалогіі ўслаўлялі волатаў. Героі паданняў — Ілья Му́рамец,


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Алёша Папо́віч, Дабры́ня Нікі́ціч — адрозніваліся велізарнай сілай. Абараняючы радзіму, яны здзяйснялі слаўныя подзвігі. Пра іх складалі гісторыі, якія перадаваліся з вуснаў у вусны, з пакалення ў пакаленне.

Але ёсць паданні, у якіх распавядаецца пра гістарычныя падзеі. Напрыклад, пра паходжанне гарадоў і вёсак, назваў гор і рэк. Так, захавалася гісторыя пра тое, што горад Кіеў атрымаў сваю назву ад імя старэйшага з трох братоў, якія прыплылі разам з сястрой да высокіх узгоркаў на беразе Дняпра.

...І былі тры браты: адзін па імені Кій, другі — Шчэк і трэці — Харыў, а сястра іх — Лыбедзь. Сядзеў Кій на гары, дзе цяпер пад'ём Борычаў, а Шчэк сядзеў на гары, якая цяпер называецца Шчэкавіца, а Харыў на трэцяй гары, якую назвалі па імені яго Харывіцай. І пабудавалі горад у гонар старэйшага свайго брата, і назвалі яго Кіеў.

*Аповесць мінулых гадоў (пераклад Д. С. Ліхачова)*

У кампазіцыі ўкраінскага скульптара Васіля Захаравіча Барада́я і архітэктара Мікалая Міхайлавіча Фе́шчанкі браты, якія плывуць у ладдзі, паказаны ў вобразе воінаў. У іх руках зброя — лук і дзіды. Браты глядзяць у розныя бакі, узіраючыся ўдалеч у пошуках зямлі. На карме ладдзі — Лыбедзь, якая накіравала позірк наперад, да далёкіх нязведаных берагоў. Яе адзенне, якое раздзімаецца па ветры, перадае імклівы рух карабля.

У беларускай міфалогіі ўзгадваюцца асілкі. Яны маглі карчаваць дрэвы, разбіваць камяні, перацягваць горы... Беларускі мастак Валерый Пятровіч Славу́к намаляваў асілка магутным і рашучым.



**Васіль Барадай, Мікалай Фешчанка.** Помнік заснавальнікам Кіева (г. Кіеў, Украіна)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Асілак — выхадзец з народа. Яго адзенне — падпяра́заная кашуля і камізэлька. На галаве — саламяны капялюш. Ён з лёгкасцю трымае ў руках ствол шматгадовага дрэва.



**Валерый Славук.**
Асілак Вярнідуб

Міфы перадаюць нам уяўленні людзей пра свет і чалавека. Яны адказваюць на самыя складаныя пытанні светабудовы. Менавіта таму міфалагічныя сюжэты, увасобленыя ў творах мастацтва, выклікаюць у сучаснага чалавека непадробную цікавасць.

Антычная мазаіка «Акіян» (г. Газіянтэ́п, Турцыя)

**П. П. Ру́бенс.** Нептун, які супакойвае шторм

**М. І. Казлоўскі.** Самсон, які раздзірае пашчу льва (г. Санкт-Пецярбург, Расія)

### Пытанні і заданні

1. З якімі міфалагічнымі персанажамі вы пазнаёміліся? Назавіце віды мастацтва, у якіх увасоблены міфалагічныя вобразы, прадстаўленыя ў параграфе.

Старажытнагрэчаскі бог Зеўс мае ў старажытнарымскай міфалогіі імя Юпітэр, Геракла завуць Геркулес. Знайдзіце ў інфармацыйных крыніцах ці ў даведачнай літаратуры старажытнарымскае імя старажытнагрэчаскага бога Пасейдона.

### Творчая майстэрня

Паглядзіце ў інфармацыйных крыніцах мультфільм «Вяртанне з Алімпу» рэжысёра А. Г. Сняжко́-Бло́цкай. Прачытайце ў кнізе М. А. Куна «Легенды і міфы Старажытнай Грэцыі» раздзел «Алімп». Складзіце вуснае апавяданне на тэму «Узыходжанне Зеўса».

2. Выканайце групавы праект «Першы подзвіг Геракла» (апавяданне, малюнак, музычна-літаратурную кампазіцыю і інш.).

**М. А. Кун.** Легенды і міфы Старажытнай Грэцыі (Алімп)


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 10. Міфы пра стварэнне і ўладкаванне свету

Пытанне пра тое, як створаны і ўладкаваны свет, цікавіла людзей больш за ўсё. Розныя народы, назіраючы за тым, што адбываецца навокал, прапаноўвалі розныя тлумачэнні ўзнікнення Сусвету.

У Старажытным Егіпце людзі верылі, што свет узнік з хаосу. Егіпцяне ўяўлялі хаос або ў выглядзе цемры, або ў выглядзе воднай стыхіі. З хаосу вылучыўся бог сонца Ра. Ён асвятліў увесь свет і знішчыў цемру. Галоўныя прыродныя стыхіі ўвасабляюць Геб — бог зямлі і Нут — багіня неба.

На рэпрадукцыі папіруса адлюстравана ўяўленне старажытных егіпцян пра ўладкаванне свету. Унізе ляжыць бог Геб. Над Гебам узвышаецца багіня Нут. Яе цела пакрыта зоркамі. У прасторы паміж Гебам і Нут змяшчаецца Тэфну́т — багіня паветра і жыватворнай вільгаці. Для жыхароў Егіпта найважнейшай крыніцай жыцця была рака Ніл. Таму і вобраз свету ўключае раку — толькі не зямную, а нябесную. Па гэтай рацэ плыве бог сонца Ра.

У старажытнагрэчаскай міфалогіі таксама сцвярджаецца, што ўсё жывое на Зямлі ўзнікла з хаосу. *«Перш за ўсё ўзнік Хаос»*, — пісаў старажытнагрэчаскі паэт Гесіёд. Але хаос, паводле ўяўленняў грэкаў, — не проста цемра ці водная стыхія. Для іх ён быў пустэчай, безданню.

Паступова з хаосу ўзнік Космас — парадак і гармонія. Пазней вылучыліся багі. Першай з'явілася Ге́я — маці-зямля, калыска свету.



Геб і Нут
(рэпрадукцыя папіруса)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Іван Айвазо́ўскі.**
Хаос (Стварэнне свету)



Атлант, які трымае нябесную сферу. Рымская копія грэчаскай скульптуры

Затым — багі, якія ўвасаблялі прыродныя стыхіі: бог неба Ура́н, бог мора Понт і бог бездані Та́ртар.

Нябесную сферу ў міфалогіі старажытных грэкаў падтрымлівае сын Геі і Урана Атла́нт — бог, які адрозніваецца незвычайнай сілай.

**Тыта́ны** — багі другога пакалення, якія валодаюць вялікай сілай.

У рымскай копіі грэчаскай скульптуры Атлант паказаны як тытан, які трымае на плячах нябесную сферу. Увасобленая ў выглядзе гіганцкага шара, яна настолькі маштабная і цяжкая, што нават магутны Атлант, які ўзваліў яе на плечы, ледзь захоўвае раўнавагу. Яго цела напружана, ногі сагнуліся пад цяжкай ношай. Галава тытана нахілена, здавалася б, ненатуральна. Але яна гэтак жа, як і плечы, служыць апорай гіганцкаму шару. Скульптар паказаў нябесную сферу ў адпаведнасці


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

з міфалагічнымі ўяўленнямі грэкаў. На ёй мы бачым лінію экватара Зямлі і зоны Паўночнага і Паўднёвага полюсаў. Зямны шар ахінаюць нябёсы, скрозь якія выразна бачныя сузор'і.

З вобразам старажытнагрэчаскага Атланта сугучны вобраз старажытнакітайскага бога Пань-гу́, стваральніка Сусвету. У міфалогіі Старажытнага Кітая Пань-гу — першы бог, які стварыў свет і даў пачатак усяму жывому на зямлі. Ён з'явіўся з хаосу, які ўяўляў сабой велізарнае яйка. Праспаўшы ў ім васямнаццаць тысяч гадоў, Пань-гу прасек сякерай шкарлупіну і рассунуў яе намаганнямі рук і ног. Святло з яйка паднялося і ўтварыла нябёсы, а цемра апусцілася і стала зямлёй. На працягу многіх стагоддзяў Пань-гу рос, падпіраў галавой нябёсы і адсоўваў іх усё далей ад зямлі. Калі ж ён памёр, яго голас стаў громам, дыханне — ветрам і аблокамі, пот — дажджом, вочы — сонцам і месяцам, цела — зямлёй, косці — камянямі, валасы — раслінамі, кроў — рэкамі.

У скульптуры, устаноўленай у кітайскім горадзе Гуанчжо́у, Пань-гу паказаны ў вобразе юнака, які разбіў шкарлупіну яйка. Ён добра складзены, моцны, як воін, энергічны і рашучы. У руцэ юнак трымае зброю, здольную пераадолець любую перашкоду. Сваёй вялікай сілай ён разбурае шкарлупіну яйка, аддзяляючы святло ад цемры, нябёсы ад зямлі.



Помнік Пань-гу
(г. Гуанчжоу, Кітай)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Мікалоюс Чурлёніс.**
Стварэнне свету

Вобразу стварэння свету прысвечаны і творы сучаснай мастацкай культуры. Літоўскі мастак Мікало́юс Канстанці́нас Чурлёніс стварыў цыкл карцін «Стварэнне свету». Аўтар не суадносіў сваю ідэю з біблейскім сюжэтам. Для яго вобраз стварэння Сусвету звязаны з іншым, выдуманым светам.

На адной з карцін цыкла мастак паказаў сваё ўяўленне пра вобраз Сусвету. З цемры з'яўляецца новае жыццё. Змрочныя фарбы хаосу змяняюцца вясёлкавымі колерамі, якія напаўняюць усю прастору сонечнымі блікамі. На паўпразрыстым фоне, нібы з лёгкай вуалі, вырастаюць яркія дэкаратыўныя кветкі. Гэта, хутчэй за ўсё, вынік фантазіі мастака. Аўтар паказвае новы свет як нешта няўстойлівае, недаўгавечнае, але заўсёды прыгожае і гарманічнае.

Французскі кампазітар Да́рыус Міё ў музыцы да балета «Стварэнне свету» прапануе сваю трактоўку ўстройства свету. На зацемненай сцэне з'яўляюцца тры божаствы. Пераплятаючыся ў складаным малюнку танца, яны сімвалізуюць адзіны пачатак свету. На фоне спакойнай мелодыі ў выкананні саксафона божаствы са слабых істот ператвараюцца ў моцныя, упэўненыя ў сабе вобразы. Музыка змяняецца, набывае цвёрды, рашучы характар.

Спрабуючы зразумець, як быў створаны і ўладкаваны Сусвет, людзі прыдумалі нямала яркіх міфалагічных вобразаў. Міфы развіваюць уяўленне майстроў мастацтва і дапамагаюць ім ствараць незабыўныя творы.

### Пытанні і заданні

1. Уважліва разгледзьце мастацкія творы, прадстаўленыя ў параграфе. Якія пачуцці яны ў вас выклікаюць?


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Паслухайце ў інфармацыйных крыніцах уверцюру да балета Д. Міё «Стварэнне свету». Які эмацыянальны водгук выклікае ў вас гэты твор? Суаднясіце музычны вобраз з адным з твораў выяўленчага мастацтва, прадстаўленых у параграфе. Растлумачце свой выбар.

### Творчая майстэрня

2. Гея, багіня зямлі, займае важнае месца не толькі ў старажытнагрэчаскай міфалогіі, але і ў сучаснай культуры. Словы «геаграфія», «геаметрыя» маюць непасрэднае дачыненне да багіні. Як, па-вашаму, можа выглядаць багіня Гея? Намалюйце яе вобраз так, як вы яго сабе ўяўляеце.

**І. Босх.** Стварэнне свету

**А. А. Шышкін.** Пярун-грамавержац

**Тынтарэ́та.** Стварэнне жывёл

**М. А. Кун.** Легенды і міфы Старажытнай Грэцыі (Нараджэнне Зеўса)

## § 11. Міфы пра стварэнне чалавека і прыроднага свету

У многіх міфах тысячагоддзі таму людзі выказалі свае ўяўленні пра тое, хто стварыў чалавека і навакольны прыродны свет. Часцей за ўсё ў міфалогіі творцамі людзей з'яўляюцца багі. У кожнага народа — свая гісторыя пра стварэнне чалавека і прыроды.

У Старажытным Егіпце лічылі, што першых людзей на ганчарным дыску вылепіў з гліны Хнум — бог-творца з галавой барана са спіральна закручанымі рагамі. Лічылася, што гэты бог стварыў і жывёл. *«Скульптар, які ажыўляе»* — так называлі Хнума ў старажытнаегіпецкіх міфах. На рэльефе бачна, як бог сядзіць перад ганчарным дыскам, дзе стаіць фігурка істоты, якую ён толькі што стварыў.



Бог-творца Хнум лепіць чалавека з гліны на ганчарным дыску. Старажытнаегіпецкі рэльеф

Паводле міфалогіі Старажытнай Грэцыі чалавека стварыў Праметэй — брат Зеўса,

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

тытан, які дапамагаў людзям. Змяшаўшы ваду з зямлёй, Праметэй вылепіў чалавека так, каб ён глядзеў не ўніз, а ўверх — на неба. Душу ў чалавека ўдыхнула багіня Афіна.

Замешав «молодую землю» «речною водой»,
Сделал подобье богов, которые всем управляют.
И между тем, как, склонясь, остальные животные в землю
Смотрят, высокое дал он лицо человеку и прямо
В небо глядеть повелел, подымая к созвездиям очи.

*Ови́дий. Метаморфозы*

Праўда, Праметэй сваю працу не завяршыў. Спачатку ён вылепіў людзей і жывёл. А прыстасаванні для жыцця стварыў асобна, з намерам акуратна размеркаваць іх паміж усімі. Верагодна, Праметэй усё разлічыў дакладна, бо яго імя па-грэчаску азначае «той, хто найперш думае».

Зашмат жывых істот стварыў Праметэй, стаміўся і заснуў моцным сном на многія стагоддзі. Пакуль Праметэй спаў, працу вырашыў завяршыць яго брат Эпіметэ́й. Ён пачаў раздаваць істотам Праметэя важныя прыстасаванні для жыцця. Бяда ў тым, што імя Эпіметэй азначае «той, хто думае пасля». Усе прыстасаванні ён патраціў на



Праметэй, які стварае першага чалавека. Рэльеф саркафага


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

жывёл, а чалавек застаўся слабым і безабаронным — *«голы і не абуты, без ложа і без зброі»*. Нікчэмнае жыццё вялі людзі, тулячыся ў сырых і цёмных пячорах.

Прачнуўшыся, Праметэй убачыў несправядлівасць і вырашыў дапамагчы людзям. Ён прынёс ім чароўны агонь. Валоданне агнём дазволіла чалавеку стаць уладаром прыроды. За гэты ўчынак Зеўс жорстка пакараў Праметэя: ён загадаў прыкаваць тытана да скалы і паслаў арла, каб той дзёўб яго печань. На донцы размаляванай старажытнагрэчаскай пасудзіны мы бачым сцэну пакарання Праметэя. Побач тытан Атлант падтрымлівае купал неба і спачувае свайму брату.


Праметэй і Атлант. Роспіс старажытнагрэчаскай пасудзіны

Зло терплю за то, что людям подарил сокровища.
В стволе сухого тростника родник огня
Я воровски припрятал. Для людей огонь
Искусства всяческого стал учителем,
Путём великой жизни. Вот за этот грех
Под зноем солнца на цепях я распят здесь.

*Эсхи́л. Прометей прикованный*

Вобраз Праметэя ўвасоблены і ў музычным мастацтве. Венгерскі кампазітар Ферэнц Ліст у сімфанічнай паэме «Праметэй» паказаў яго з незвычайнага боку. Аўтар музычнага твора ўбачыў у Праметэі не проста тытана, які супрацьстаіць Зеўсу, а асобу, якая глыбока пакутуе. Энергічная мелодыя, якая гучыць спачатку, нечакана змяняе характар. У музыцы з'яўляюцца інтанацыі пакуты і мальбы. Моцны духам чалавек смуткуе пра лёсы свету. Так глыбока раскрывае кампазітар вобраз Праметэя — яго надзвычайную ўпартасць і нязломную волю.

Іншы вобраз убачыў і перадаў у сімфанічнай паэме «Праметэй» рускі кампазітар Аляксандр Мікалаевіч Скра́бін. Падчас выканання

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

твора можна пачуць музыку і ўбачыць гульню святла. Паводле задумы аўтара, карціна першароднага свету павінна паступова напаўняцца не толькі музычнымі гукамі і фарбамі, але і святлом. У каляровым асвятленні галоўным выбраны фіялетавы колер як сімвал змяркання. Ад цёмных адценняў — да светлых і яркіх, ад цемры і хаосу — да святла і гармоніі. У канцы паэмы зала аслеплена сонечным святлом. Свет адбыўся. Кампазітар паказаў вобраз тытана як праваднiка святла і энергіі.

Сюжэт пра Праметэя цікавіць і сучасных аўтараў. Майстры мастацтва, узіраючыся ў тытана, адкрываюць у ім новыя грані. Арыгінальна раскрыў старажытнагрэчаскі сюжэт пра Праметэя расійскі скульптар Раман Яфімавіч Красні́цкі. Пры першым поглядзе на скульптуру зразумела: магутнага, цудоўна складзенага чалавека праследуе велізарны арол.

Пастаментам скульптуры служыць мармуровы фрагмент антычнай калоны. Менавіта фрагмент, таму што сюжэт — антычны, а рашэнне — сучаснае. Апорай кампазіцыі з'яўляецца металічны штыр, які надае ёй палётнасць. Кампазіцыйна скульптура ўраўнаважаная. З розных бакоў пастамента лунаюць Праметэй і арол, пасланы Зеўсам для пакарання тытана.



**Раман Красніцкі.** Праметэй (Выкраданне агню) (г. Санкт-Пецярбург, Расія)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Майстры мастацтва, натхнёныя міфалагічнымі сюжэтамі, заклікаюць нас, гледачоў і слухачоў, задумацца пра тое, наколькі моцны і прыгожы чалавек, якое месца ён займае ў гэтым свеце.

### Пытанні і заданні

1. Раскажыце, з якіх «матэрыялаў» ствараліся жывыя істоты паводле міфалагічных сюжэтаў, прадстаўленых у параграфе.

Паглядзіце ў інфармацыйных крыніцах мультфільм «Праметэй» рэжысёра А. Г. Сняжко-Блоцкай. За што быў пакараны галоўны герой? Абмяркуйце свае ўражанні з аднакласнікамі.

### Творчая майстэрня

Прачытайце ў інфармацыйных крыніцах значэнне словазлучэнняў «ахілесава пята», «гордзіеў вузел», «дамоклаў меч». Складзіце слоўнічак словазлучэнняў міфалагічнай тэматыкі. Падрыхтуйце прэзентацыю пра адно са словазлучэнняў.

**Г. Маро́.** Праметэй

**П. Ме́ншып.** Праметэй (г. Нью-Ёрк, ЗША)

## § 12. Жаночы вобраз у міфалогіі

У міфах народаў свету можна сустрэць розныя жаночыя вобразы. Кожны з іх надзелены тымі якасцямі, якімі захапляліся жыхары старажытных дзяржаў. Жаночыя вобразы натхняюць і сучасных людзей.

Многія міфалагічныя жаночыя вобразы з'яўляюцца ўвасабленнем *дасканалай прыгажосці*. Самай вядомай багіняй-прыгажуняй лічыцца старажытнагрэчаская Афрадыта. У Старажытным Рыме яе называлі Венерай. Захавалася нямала выяў багіні, створаных



**Алкаме́н.** Афрадыта ў садах (рэканструкцыя)

у часы Антычнасці. Але і ў наступныя эпохі майстры мастацтва малявалі, ляпілі і ўслаўлялі ў вершах і прозе чароўную прыгажосць яе твару і фігуры. Уменне перадаць у творы мастацтва дасканаласць прыгажосці і цяпер лічыцца найвышэйшым дасягненнем майстра. Таму вобраз Афрадыты і сёння натхняе на стварэнне твораў мастацтва.

И снова мы к тебе стекаемся толпами;
Молчание храня, с поднятыми очами,
Любуемся тобой;
Ты снова царствуешь!

*И. С. Тургенев*

Из пены морской Афродита ступила на землю,
Оставив следы из фиалок на мокрой траве...
Увидели боги — никто не сравняется с нею!
Никто не завидовал даже её красоте...

*В. Ф. Ходасевич*



Афіна Варвакіён
(копія статуі Фідыя)

Некаторыя міфалагічныя жаночыя вобразы ўвасабляюць *мудрасць* і *майстэрства*. Менавіта гэтымі якасцямі, паводле ўяўленняў старажытных грэкаў, славілася Афіна. Яе шанавалі і як дзеву-воіна, якая выдатна кіруе бітвамі, і як заступніцу шматлікіх рамёстваў, што дае настаўленні цеслярам і ганчарам. Афіна лічылася таксама вопытнай рукадзельніцай — ткачыхай. У адной са статуй Афіны-дзевы, якая не захавалася да нашага часу, грэчаскі скульптар Фідый увасабляе мужнасць, рашучасць, адвагу багіні. У правай руцэ яна трымае статуэтку Нікі — багіні перамогі, у левай — дзіду (не захавалася). Ля ног — шчыт, які сімвалізуе стойкасць у баі. Шыкоўнае адзенне, вытка-


Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Уільям Райнхарт.** Латона з Апалонам і Артэмідай

нае самой багіняй, дапоўнена ўпрыгожаннем з выявай галавы страшнай пачвары Медузы Гаргоны.

Адно з ганаровых месцаў у міфалогіі займаюць *вобразы багінімаці*. Цуд нараджэння новага чалавека, клопат пра дзяцей, надзея і трывога за іх будучыню — усе фарбы жыцця жанчыны-маці атрымалі ўвасабленне ў мастацтве. Мастакоў наступных эпох яны прыцягваюць цеплынёй і шчырасцю пачуццяў, замілаваннем, захапленнем і гонарам за сваіх дзяцей.

Амерыканскі скульптар Уі́льям Ра́йнхарт стварыў кампазіцыю, якая паказвае старажытнагрэчаскую багіню Лато́ну з яе малышамі-двайнятамі. Калі дзеці Латоны вырастуць, дзяўчынка стане багіняй-паляўнічай, а хлопчык — выдатным музыкантам, заступнікам мастацтваў. Але пакуль што яны проста маленькія дзеці, і маці любуецца іх салодкім сном. Колькі пяшчоты ў прыгожым твары Латоны!

Важнае месца жаночыя вобразы займаюць і ў *славянскай міфалогіі*. Адной з ушанаваных багінь у славян са старажытных часоў была Берагі́ня.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Барыс Альшанскі.** Берагіня

Паходжанне імені гэтай багіні звязвалі з «берагам» і «абярэгам». Славяне верылі, што Берагіня жыве ў лясах, на берагах рэк, абараняе людзей ад злых духаў і ратуе дзяцей, якія тонуць. Берагіню лічылі прамаці ўсяго жывога на зямлі. Уяўлялі яе ў вобразе маладой жанчыны з доўгімі косамі, акружанай ззяннем сонечных промняў. Напачатку лета, калі каласуе жыта, прыгажуня Берагіня выходзіць на бераг ракі, гушкаецца на бярозавых галінах, распускае косы, пляце вянкі.

Рускі мастак Барыс Міхайлавіч Альша́нскі на карціне «Берагіня» намаляваў багіню ў вобразе дзяўчыны, якая загадвае сіламі прыроды — зменай дня і ночы, разлівамі рэк, вятрамі. Юная багіня ў святочным уборы з нацыянальным каларытам нібы ўздымаецца з воднай стыхіі да нябёсаў. У правай руцэ яна трымае бурштынавы шар — сонца, якое дорыць святло і цяпло, а левай — адводзіць хвалю, засцерагаючы людзей ад паводак.



**Валерый Славук.** Цёця

У міфалогіі беларусаў багіняй лета, якая адорвае ўраджаем сялян, лічылася Цёця. Паводле павер'яў, яе можна было сустрэць



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

у палях, сярод стагоў сена. Цёця — шчодрая немаладая жанчына. На яе галаве — вянок з каласамі, у руках — спелыя плады. Менавіта так намаляваў багіню беларускі мастак Валерый Пятровіч Славук. Цёця паўстае перад намі ў народным строі, багата ўпрыгожаным традыцыйнай вышыўкай. Яе добрая ўсмешка абяцае шчодрасць і дабрабыт. Жэст правай рукі, якім багіня паказвае на сабраны ўраджай, быццам запрашае нас паспытаць дары беларускай прыроды.

У творах мастацтва, навеяных міфалогіяй, на першы план выступаюць лепшыя жаночыя якасці. Яны дапамагаюць нам захапляцца жанчынай і шанаваць яе.

### Пытанні і заданні

1. Міфалагічныя жаночыя вобразы адлюстроўваюць уяўленні пра ролю жанчыны ў грамадстве. Якія з жаночых «роляў» вы лічыце найважнейшымі? Праілюструйце свой адказ творамі мастацтва, прадстаўленымі ў параграфе.

2. Які з разгледжаных у параграфе жаночых міфалагічных вобразаў атрымаў, на ваш погляд, найбольш цікавае ўвасабленне ў творах мастацтва? Чаму?

### Творчая майстэрня

У многіх жаночых вобразаў у міфалогіі існуюць два імёны: у Старажытнай Грэцыі — Афрадыта, у Старажытным Рыме — Венера. Старажытнагрэчаская багіня Афіна ў старажытнарымскай міфалогіі таксама мае іншае імя. Знайдзіце яго ў інфармацыйных крыніцах.

Разгледзьце на кампакт-дыску карціны Рэмбранта і В. А. Сярова, створаныя пад уражаннем міфа пра прыгожую багіню Еўропу. Прачытайце міф у інфармацыйных крыніцах. Складзіце пра карціны вуснае апавяданне.

**Рэмбрант.** Выкраданне Еўропы

**В. А. Сяроў.** Выкраданне Еўропы

Азнаёмцеся з дадатковымі старонкамі на кампакт-дыску да раздзела «Міфалогія ў мастацтве». Выканайце адно з заданняў.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Раздзел 4

# Свята ў жыцці людзей

Свята трэба заўсёды насіць з сабой...

*Эрнэ́ст Хэмінгуэ́й*



**Ганна Сіліво́нчык.** Самая зорная ноч

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

*Свята — нязменны спадарожнік чалавека. Дзень нараджэння, Новы год, Масленіца, Каляды і іншыя святы займаюць асаблівае месца ў жыцці. Іх чакаюць, ім радуюцца, імі захапляюцца…*

*Яркія падзеі ў жыцці, як сустрэча вясны, збор ураджаю, вяселле ці нараджэнне дзіцяці, людзі заўсёды суправаджалі песнямі, танцамі, гульнямі.*

*Таму святочныя дні адрозніваюцца ад будзённых. На некаторы час чалавек адчувае свабоду, забывае пра клопаты і турботы. Святы напоўнены аптымізмам, маюць жыццесцвярджальны характар, прыўносяць у жыццё людзей радасць і весялосць. І дарослыя, і дзеці ў чаканні свята знаходзяцца ў прыўзнятым настроі, прадчуваюць задавальненне і асалоду.*

## § 13–14. Святы ў розных культурах свету

У жыцці асобнага чалавека, як і ў жыцці народа, існуе мноства свят. Але ў большасці выпадкаў яны маюць адну аснову.

Першыя святы сыходзяць каранямі ў глыбокую старажытнасць. Самыя важныя з іх былі звязаны з міфалагічнымі божаствамі, якія ўвасаблялі прыродныя сілы. Заклікаючы іх да літасці, жадаючы прывабіць на свой бок ці, наадварот, адпудзіць, чалавек прысвячаў старажытным божаствам, прыродным стыхіям і свяшчэнным жывёлам розныя абрады і рытуалы. Звяртаючыся да іх, чалавек шукаў у іх абарону і заступніцтва. Напрыклад, некаторыя народы здзяйснялі



Абрад перад паляваннем

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Фрагмент штандара (старажытны горад Ур, Месапатамія)

абрадавыя танцы са спевамі вакол вогнішча, арганізоўвалі пір і ўзносілі да багоў малітвы аб літасці.

Музыка здаўна была нязменным упрыгожаннем свята. Сумесны спеў і рухі ў агульным рытме давалі людзям адчуванне важнасці і значнасці таго, што адбываецца.

Музыка суправаджала і піры ў гонар цара, і перамогі, здабытыя ў ваенных паходах. Адзін з эпізодаў мірнага жыцця шумераў — свята ля царскага трона — увасоблены ў штандары (каменнай мазаіцы). Мазаічная кампазіцыя выкладзена з кавалачкаў лазурыту і чырвонага вапняку. Майстар адлюстраваў не толькі высокапастаўленых асоб, якія паднімаюць чашы з віном у гонар цара. З той жа ўвагай ён паказаў і музыканта, які выконвае гучную мелодыю на старажытным струнным інструменце.

Прайшло шмат тысяч гадоў, перш чым людзі сталі адзначаць святы ў пэўны час. Спачатку час для здзяйснення абрадаў вызначаўся паводле прыродных рытмаў і традыцый народаў. Паступова склаўся каляндар, у якім кожнаму божаству, з'яве прыроды, падзеі знайшлося пэўнае месца. *Каляндарныя* святы атрымалі адлюстраванне ў творах мастацтва.

Свята наступлення новага года нашы продкі называлі Калядамі. Падчас калядных свят на вуліцах ладзіліся тэатралізаваныя дзеянні. Калядоўшчыкі прыбіраліся ў касцюмы і маскі, ствараючы вобразы жывёл і птушак, якіх асабліва шанавалі. На беларускіх землях гэта былі мядзведзь, каза і бусел. Лічылася, што гэтыя жывёлы спрыяюць дастатку і ўраджаю.


Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Аксана Архíпава.**
Калядныя песні

Каляды — вясёлае свята. Яго адзначаюць і сёння. Калядоўшчыкі спяваюць песні, забаўляюць сустрэчных людзей жартамі-прымаўкамі і заклікаюць гаспадароў хаты не скупіцца на пачастункі — тады і ў новым годзе ў іх будзе багаты стол. Музыка, літаратура, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, пераплятаючыся, ператвараюць святочную дзею ў *тэатралізацыю*.

**Тэатралізáцыя** — дзея, у якой спецыяльна прыбраныя людзі паводзяць сябе і як звычайныя людзі, і як пэўныя персанажы.

У чаканні вясны людзі святкуюць развітанне з зімой — Масленіцу. Абавязковы атрыбут масленічных гулянняў — пудзіла Масленіцы. Яго спальваюць, а попел раскідваюць па зямлі. Лічыцца, што пасля спальвання Масленіца перадасць сваю энергію палям, абароніць іх і прынясе ў будучым годзе багаты ўраджай. На Масленіцу людзі радуюцца, катаюцца на санках, спяваюць масленічныя песні і абавязкова ядуць бліны — знак Сонца, нябеснага свяціла.

Ай, как мы Масленицу дожидали,
Дожидали, люли, дожидали.
Сыром горушки укладали,
Укладали, люли, укладали.
С верхом маслицем поливали.

*Масленичная песня*

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Барыс Кустодзіеў.**
Масленіца

На карціне «Масленіца» рускі мастак Барыс Міхайлавіч Кусто́дзіеў перадаў атмасферу карнавалу, якая пануе на гуляннях. Яркія фарбы, нібы звонкія бразготкі, напаўняюць музыкай казачны гарадскі пейзаж. Яшчэ пакрытыя снегам дарогі ўдыхаюць павеў вясны. Баяры, купцы, сяляне — усе выйшлі на вуліцы горада праводзіць зіму.

У культуры розных краін і народаў свету асобнае месца займаюць *рэлігійныя* святы. У царкоўным календары хрысціян адным з галоўных свят з'яўляецца Вялікдзень. Свята Уваскрэсення Хрыстова, якое



**Эдуард Паноў.**
Светлае Хрыстова
Уваскрэсенне



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

адзначаецца пасля Вялікага паста, мае шматвяковую традыцыю. Да яго рыхтуюць шчодры стол, пякуць кулічы́, фарбуюць яйкі.

У нацюрморце рускага мастака Эдуарда Парфір’евіча Пано́ва «Светлае Хрыстова Уваскрэсенне» адлюстраваны сімвалы Вялікадня. Фарбаваныя яйкі і кулічы сімвалізуюць новае жыццё, запаленая свечка — велікодны агонь, галінкі вярбы ў збане, кветкі ў плеценым кошыку і на стале — вясновае абуджэнне прыроды пасля зімовага сну. Побач ручнік — знак нацыянальнай культуры, нязменны атрыбут свята. Дзесьці ўдалечыні, за акном, віднеецца царква. Гукі яе званоў у цішы даносяцца да ўсіх жыхароў, нагадваючы пра чысціню веры.

У многіх народаў свету існуюць асаблівыя *нацыянальныя* святы. Яркія і незвычайныя, яны збіраюць не толькі жыхароў сваёй краіны. Госці спецыяльна прыязджаюць з розных куткоў планеты, каб стаць гледачамі, а можа, і ўдзельнікамі свята.



Фестываль кветак (Нідэрланды)

Самыя вядомыя святы ў свеце — фестываль кветак у Нідэрландах, фестываль агню ў Шатландыі, светлавое шоу ў Германіі, фестываль фарбаў у Індыі і свята ліхтароў у Кітаі.



Фестываль агню (Шатландыя)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Мікалай Багда́наў-Бе́льскі.** Дзень нараджэння настаўніцы

У розных кутках планеты людзі святкуюць найважнейшыя падзеі, звязаныя з жыццём іх сям'і, — нараджэнне, паўналецце, канец вучобы, вяселле і г. д. Гэта *сямейныя* святы. У кожнай сям'і існуюць свае традыцыі і нормы святкавання такіх падзей. Але адно застаецца нязменным: музыка, танцы, смех і добры настрой спадарожнічаюць усім сямейным святам. Жадаючы арыгінальна адзначыць сямейную падзею, людзі ўпрыгожваюць дом, гатуюць пачастункі. З надзеяй і радасцю чакаюць сяброў і блізкіх, прапануюць ім цікавыя забавы і падарункі.

У большасці краін свету ёсць асаблівыя святы — *дзяржаўныя*. У гэтыя дні адзначаюць гадаві́ны найважнейшых падзей у гісторыі краіны. Дзяржаўныя святы з'яўляюцца сімвалам яднання народа. Яны аб'ядноўваюць людзей гонарам за сваю краіну, агульнымі ўспамінамі і надзеямі.

У Рэспубліцы Беларусь галоўнае дзяржаўнае свята — Дзень Незалежнасці — адзначаецца 3 ліпеня. У гэты дзень у 1944 годзе адбылося вызваленне горада Мінска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Штогод 3 ліпеня ў горадзе праходзяць святы і гулянні. У мастацкім афармленні свята спалучаюцца і традыцыйныя віды мастацтва (танец, музыка, жывапіс), і адносна новыя (напрыклад, феерверк).


Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Святочны парад да Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь (г. Мінск)



Святочны салют да Дня Перамогі (г. Мінск, Беларусь)

Свята — гэта заўсёды ўрачыстасць. Яно стварае настрой, дае магчымасць выразіць сябе ў розных відах мастацтва. Жаданне людзей урачыста святкаваць значныя падзеі ва ўсе часы застаецца нязменным.

### Пытанні і заданні

1. На якіх каляндарных святах вам даводзілася бываць? Якія віды мастацтва вядуць дыялог падчас гэтых свят?

2. Якія святы вы заўсёды адзначаеце ў вашай школе? Якія віды мастацтва сустракаюцца на гэтых святах?

### Творчая майстэрня

3. Прыдумайце і выканайце незвычайную паштоўку-віншаванне з адным са свят.

**П. Бр́эйгель Старшы.**
Бітва Масленіцы і Паста (фрагмент)
**Л. Бём.** Віншавальныя навагоднія паштоўкі

4. На якім са свят іншых краін вы хацелі б пабываць? Выканайце эскіз касцюма для аднаго з гэтых свят.

Азнаёмцеся з дадатковымі старонкамі на кампакт-дыску да раздзела «Свята ў жыцці людзей». Выканайце адно з заданняў.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# Раздзел 5
# Тэатр бачны і нябачны

Спектакль жыве толькі сёння — на тваіх вачах, і больш гэта імгненне ніколі не паўторыцца.

*Юрый Стаянаў*



Сцэна з оперы «Аіда». Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь (г. Мінск)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

*«Давайце пагуляем!» — часта чуем мы. Гуляць любяць і дзеці, і дарослыя. Тэатр — гэта таксама гульня. У тое імгненне, калі ў глядзельнай зале згасае святло, глядач з рэальнага свету перамяшчаецца ў свет уяўны. Рэальныя месцы дзеяння: горад, вёска, лес, дом — у тэатры ствараюцца наноў. Глядач з радасцю верыць у гэты ўяўны свет. Вядома, ён разумее, што лес на сцэне не сапраўдны, а дом не мае падмурка... Але ўсё гэта падчас тэатральнага спектакля «забываецца». Ахвотна прымаючы ўмовы гульні, глядач пражывае разам з героямі цэлае жыццё!*

*Няма больш таямнічага і загадкавага мастацтва, чым тэатр. Яркае і маляўнічае сцэнічнае відовішча можа ўсхваляваць любога чалавека. Сустрэча з тэатрам часта становіцца незабыўнай падзеяй у жыцці людзей.*

## § 15. Вытокі тэатра

Тэатралізаваныя дзеі з глыбокай старажытнасці з'яўляюцца неад'емнай часткай культуры чалавецтва. У многіх культурах свету існуюць элементы гульні. Рытуалы, пышныя святы і ўрачыстасці, рэлігійныя абрады — усюды прысутнічаюць пераўвасабленне і тэатралізацыя.



Дыяніс. Роспіс старажытнагрэчаскай пасудзіны

Як самастойны від мастацтва тэатр зарадзіўся ў Старажытнай Грэцыі. Свой пачатак ён вядзе ад народных гулянняў у гонар вясёлага бога Дыяні́са. Дыяніс — заступнік раслiннасці, урадлівасці, вінаградарства і вінаробства. Вясной, калі расцвіталі сады, жыхары гарадоў Старажытнай Грэцыі выходзілі ўслаўляць

Дыяніса і прасілі яго падарыць новы багаты ўраджай. Свята атрымала назву «Вялікія Дыянісіі».

Падчас святкавання моладзь прыбіралася, ладзіла гульні, спявала ў гонар Дыяніса хвалебныя песні — *дыфіра́мбы*. З урачыстай часткі свята вылучылася *трагедыя*, з вясёлай — *камедыя*. Менавіта ў тыя далёкія часы нарадзіліся асноўныя тэатральныя жанры.

Найбольш папулярнымі сюжэтамі ў старажытнагрэчаскім тэатры былі міфы. Такія персанажы антычнага тэатра, як Дыяніс, Геракл, Праметэй, добра вядомыя і ў сучасным тэатры. З цягам часу міфалагічныя сюжэты ўскладняліся бытавымі і сацыяльнымі матывамі. Аўтары п'ес — *драматургі* — сталі цікавіцца жыццём асобнага чалавека, паказваючы яго супярэчлівыя эмоцыі і пачуцці.

Спектаклі ў старажытнагрэчаскім тэатры арганізоўваліся ў выглядзе спаборніцтва. Тры паэты — аўтары п'ес — спаборнічалі паміж сабой. Кожны з іх на працягу аднаго дня прадстаўляў тры трагедыі. Пераможца атрымліваў вянок з плюшчу, а яго імя выбівалі на памятных мармуровых дошках. Крыху пазней творчая барацьба разгаралася не толькі паміж аўтарамі, але і паміж акцёрамі і хорам.



План старажытнагрэчаскага тэатра:
1 — амфітэатр; 2 — праскеній;
3 — скена; 4 — архестра

Старажытнагрэчаскі тэатр будаваўся на адкрытай пляцоўцы, меў вялікія памеры і змяшчаў велізарную колькасць гледачоў.



Адноўлены тэатр (г. Эпідаўр, Грэцыя)


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Круглая пляцоўка, на якой выступалі хор і акцёры, атрымала назву *архе́стра*. Ззаду архестры ўстанаўлівалі палатку — *скéну*, у якой пераапраналіся выканаўцы. Пазней на месцы палаткі сталі будаваць каменнае памяшканне, афармленае ў выглядзе храма ці палаца. Перад скенай рабілі памост — *праске́ній*. На ім адбываліся самыя важныя падзеі. Здаралася, што падчас прадстаўлення персанажы «прыляталі» з-за скены ці раптоўна з’яўляліся з «падземнага свету». Грэкі любілі тэатральныя эфекты.

Спачатку гледачы размяшчаліся вакол архестры на схілах скалістага ўзгорка. Пазней для іх сталі высякаць у скальным грунце ступеньчатыя лавы, якія ўтваралі паўкола, *амфітэатр*.

Акцёры антычнага тэатра карысталіся вялікай пашанай і займалі высокае становішча. Вялікія памеры тэатра абумовілі некаторыя асаблівасці іх касцюмаў. Для таго каб акцёраў можна было разгледзець здалёк, яны надзявалі вялікія маскі. Кожная маска адлюстроўвала пэўны стан: радасць, жах, засмучэнне і г. д. Змяняўся сюжэт, змяняўся стан героя спектакля — змяняліся і маскі. Яны былі настолькі вялікімі, што часта скажалі прапорцыі цела. Для таго каб фігура выглядала прапарцыянальнай, акцёры рабілі адзенне доўгім, а на ногі надзявалі спецыяльны абутак на высокай платформе — *кату́рны*. Фігура на катурнах выглядала больш высокай і значнай.

Колеравая гама і даўжыня касцюмаў таксама мелі сімвалічнае значэнне. Акцёр у ярка-чырвоным ці белым адзенні выконваў ролю прадстаўніка царскай сям’і, у чорным адзенні — прадвесніка няшчасця. Ролі шчаслівых людзей адзначаліся жоўтай ці чырвонай паласой, няўдачнікаў — сіняй ці зялёнай.


Спектакль у антычным тэатры

Колькасць акцёраў, якія ўдзельнічалі ў тэатральнай пастаноўцы, не перавышала трох. Таму кожны акцёр выконваў некалькі роляў. Жаночыя ролі заўсёды выконвалі мужчыны. Пры гэтым усе яны павінны былі добра валодаць акцёрскім

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Фрагмент старажытнагрэчаскага вазапісу

майстэрствам — дэкламаваць вершы, спяваць і танцаваць. Ужо з часоў Антычнасці да выканаўцаў прад'яўляліся высокія патрабаванні, таму акцёрам неабходна было шмат працаваць над сабой.

Старажытнагрэчаскі тэатр стаў пачаткам нараджэння тэатра як віду мастацтва. З тых часоў многае змянілася, але глядач, як і раней, спяшаецца на тэатральнае прадстаўленне — пасумаваць і парадавацца разам з героямі, стаць удзельнікам тэатральнага відовішча.

## Пытанні і заданні

Паглядзіце ў даведачнай літаратуры значэнне старажытнагрэчаскіх слоў «архестра», «скена». Параўнайце іх са значэннем сучасных слоў «аркестр», «сцэна». Чым яны адрозніваюцца?

1. Некаторыя элементы антычнага тэатра, напрыклад амфітэатры, можна ўбачыць у відовішчных збудаваннях і сёння. Прывядзіце некалькі прыкладаў сучасных амфітэатраў.

2. Сёння ў тэатры маскі выкарыстоўваюцца рэдка. Як вы думаеце, для стварэння якіх сцэнічных вобразаў можа спатрэбіцца гэты тэатральны атрыбут?

## Творчая майстэрня

Уважліва разгледзьце выявы антычных тэатраў на кампакт-дыску. Прапануйце сюжэты прадстаўленняў, якія было б цікава разыграць на гэтых пляцоўках для сучасных гледачоў.

Выявы антычных тэатраў



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## 16–18. Сродкі мастацкай выразнасці ў тэатральным мастацтве

Тэатр, як і ўсе віды мастацтва, валодае сваімі сродкамі мастацкай выразнасці. З іх дапамогай аўтары тэатральнага твора ўздзейнічаюць на гледача, выклікаюць у яго зваротную рэакцыю.

У аснове спектакля, нават калі ў ім не прамаўляецца ніводнага слова, часцей за ўсё знаходзіцца літаратурны твор — *драма*. У ёй шмат дзеяння. Гэта азначае, што сюжэт развіваецца не праз апісанне таго, што адбываецца, як, напрыклад, у апавяданні, а праз падзеі і ўчынкі дзеючых асоб.

**Дзе́янне** — падзея, сутыкненне інтарэсаў.

Самым папулярным відам тэатральнага мастацтва з'яўляецца *драматычны тэатр*. Напісаныя для яго творы маюць своеасаблівую форму. Пасля назвы п'есы ўказваецца жанр (напрыклад, трагедыя, камедыя ці драма) і даецца спіс персанажаў — *дзеючых асоб*. Часам побач з імёнамі герояў указваюцца іх характарыстыкі: узрост, становішча ў грамадстве, асаблівасці знешняга выгляду.



Сцэна са спектакля «Несцерка». Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Якуба Коласа (г. Віцебск, Беларусь)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Віталь Вольскі

**Несцерка**

Камедыя ў трох дзеях, сямі карцінах

**Дзеючыя асобы:**

Несцерка.
Юрась.
Мацей — ганчар.
Насця — дачка Мацея.
Мальвіна — жонка Мацея і інш.

**Дзея першая**

**Карціна першая. Кірмаш**

*Збоку, з-за куліс, аглядаючыся, выбягае на авансцэну перад заслонай Несцерка. Убачыў публіку ў зале, спыніўся. Кланяецца.*

**Несцерка** *(перад заслонай, да публікі)*. Добры вечар, сябры! Эге, колькі вас тут сабралася! Не раўнуючы, як дроў у лесе. Але ж ці няма сярод вас і тых дурняў, што за мною гоняцца? *(Углядаецца ў залу.)* Здаецца, няма... Вядома, у страху вочы вялікія. Апёкся на малацэ, дык і на халодную ваду дзьмуць будзеш...

Асноўны тэкст п’есы складаецца з *рэплік* герояў. Як правіла, гэта дыялог некалькіх персанажаў. Часта ў п’есе сустракаюцца спецыяльныя тлумачэнні — *рэмаркі*, у якіх драматург апісвае месца дзеяння ці характар паводзін і настрой героя.

**Рэ́пліка** — з фр. «адказ».

**Рэма́рка** — з фр. «пазнака».

Галоўны герой п’есы беларускага драматурга Віталя Вольскага — Несцерка. Яго можна назваць народным філосафам. Здзяйсняючы розныя ўчынкі, нават самыя авантурныя, ён заўсёды імкнецца іх растлумачыць. У тлумачэннях героя выражаецца мудрасць народа. Назіраць за ўчынкамі Несцеркі на сцэне не толькі цікава, але і павучальна: вясёлы і бесклапотны, ён заўсёды знаходзіць выйсце са складанага становішча, дапамагае іншым і атрымлівае за гэта ўзнагароду. Прастата, адкрытасць


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

і эмацыянальнасць Несцеркі адчуваюцца ўжо ў першых яго рэпліках. З дапамогай рэмарак «лагодна», «рашуча», «задумаўся» драматург падкрэслівае знаходлівасць і кемлівасць галоўнага героя.

Літаратурны тэкст на мову сцэны «перакладаюць» рэжысёр, мастак, кампазітар, харэограф і акцёры. Менавіта гэты аўтарскі калектыў стварае свет спектакля, раскрывае галоўную ідэю тэатральнага твора.

Адным з галоўных аўтараў сцэнічнага твора з'яўляецца *рэжысёр*. Асноўны сродак выразнасці ў рэжысёра — *мізансцэна*. Мізансцэны ўвесь час змяняюць адна адну ў пэўным рытме. Рэжысёр спектакля «Несцерка» выбудоўвае свет глыбокіх чалавечых адносін з дапамогай масавых сцэн. У іх, з пункту гледжання рэжысёра, асабліва ярка выражаюцца характары і ўзаемаадносіны герояў.

**Мізансцэ́на** — размяшчэнне акцёраў на сцэне.

Адначасова з рэжысёрам над пастаноўкай працуе *мастак*. У яго арсенале знаходзяцца такія сродкі выразнасці, як дэкарацыі, касцюмы і грым.

*Дэкарацыі* ў спектаклі «Несцерка» падкрэсліваюць святочную атмасферу. Падзеі адбываюцца ў прасторы, абрамлёнай драўлянымі аркамі, якія ўпрыгожаны багатай разьбой, тканымі пакрываламі і подсцілкамі,

**Дэкара́цыя** — вобраз прасторы, у якой адбываюцца падзеі.





Сцэны са спектакля «Несцерка». Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Якуба Коласа (г. Віцебск, Беларусь)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

трыма радамі вясельных ручнікоў. Дэкарацыя з квітнеючай яблыняй сімвалізуе пяшчоту і юнацтва. На сінім фоне, дзякуючы падсветцы, дрэва і кветкі выглядаюць жывымі.

Сцэнічны *касцюм* «расказвае» гледачу пра характар і настрой дзеючых асоб. Яркія, выразныя касцюмы герояў спектакля «Несцерка» характарызуюць эпоху і даюць пэўнае ўяўленне пра персанажаў-беларусаў. Шляхецкае адзенне са слуцкімі паясамі арганічна спалучаецца з народнымі строямі. Асабліва ўражвае багацце ўнікальных колеравых і арнаментальных малюнкаў у жаночых касцюмах.

Дзякуючы новым тэхналогіям у сучасным тэатры з'яўляюцца ўнікальныя дэкарацыі і касцюмы. Напрыклад, басейн на сцэне, сцэна ў форме самалёта ці сукенка гераіні, падол якой з цяжкасцю трымаюць у руках усе дзеючыя асобы спектакля!

**Акцёр** — з гр. «той, які дзейнічае».

**Міміка** — выражэнне на твары розных эмоцый.

Не менш важная асоба ў тэатры — *акцёр*. Жывое акцёрскае выкананне вылучае тэатр сярод іншых відаў мастацтва. Кожны акцёр стварае сцэнічны вобраз — *іграе ролю*, гэта значыць становіцца на сцэне іншым чалавекам, паказвае яго пачуцці і эмоцыі. Для стварэння сцэнічнага вобраза акцёр выкарыстоўвае *свае* сродкі выразнасці: словы, тэмбр голасу, інтанацыі, рухі, жэсты і міміку.

Найважнейшым выразным сродкам спектакля таксама з'яўляецца *музыка*. З яе дапамогай кампазітар настройвае гледача на эмацыянальную хвалю спектакля — вясёлую, лірычную ці сумную. Музыка падкрэслівае рытм пастаноўкі, раскрывае душэўны стан герояў.



Сцэна са спектакля «Утаймаванне свавольнай». Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Максіма Горкага (г. Мінск, Беларусь)

Кампазітар спектакля «Несцерка» часта звяртаецца да народных мелодый. Напрыклад, у сцэне вяселля гучыць мелодыя беларускай песні «Ляцелі гусанькі цераз сад», у фінале — «Лявоніхі»,


Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Сцэна са спектакля «Князь Вітаўт». Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы (г. Мінск, Беларусь)

а з'яўленне аднаго з герояў на сцэне суправаджаецца гукамі мазуркі.

У сучасным тэатры для дасягнення эфекту відовішчнасці выкарыстоўваюцца і мультымедыйныя сродкі выразнасці. Гэта разнастайныя светлавыя і гукавыя эфекты. Напрыклад, ілюзія конніцы, якая праносіцца скрозь залу, або цягніка, які набліжаецца здалёк. Часткай дэкарацый становяцца фатаграфіі, анімацыйныя і кінавыявы, аб'ёмныя праекцыі.



Сцэна са спектакля «Чаму старэюць людзі?» (рэжысёр Аляксей Ляля́ўскі, мастак Таццяна Нерсіся́н). Беларускі дзяржаўны тэатр лялек (г. Мінск, Беларусь)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Тэатр — сінтэтычны від мастацтва. Дзякуючы злучэнню выразных сродкаў літаратуры, выяўленчага мастацтва, музыкі, харэаграфіі і магчымасцей мультымедыя ў тэатры ствараюцца запамінальныя сцэнічныя вобразы.

### Пытанні і заданні

1. Растлумачце, як вы разумееце выраз «ужывацца ў ролю».

2. Ахарактарызуйце сродкі выразнасці тэатральнага мастацтва ў прагледжаным вамі спектаклі (фрагменце спектакля).

### Творчая майстэрня

3. Візітнай карткай спектакля з'яўляецца афіша. Яна запрашае гледача да прагляду тэатральнай пастаноўкі. Выканайце эскіз афішы да прагледжанага вамі спектакля.

Праслухайце ў інфармацыйных крыніцах музычна-драматычную кампазіцыю «Сіняя птушка» М. Метэрлінка па спектаклі Маскоўскага мастацкага акадэмічнага тэатра СССР імя Максіма Горкага «Сіняя птушка» (аўтар і вядучая Н. І. Сац, кампазітар І. А. Сац). Выканайце эскізы дэкарацый і касцюма аднаго з герояў гэтага спектакля.

## § 19. Як уладкаваны тэатр

Тэатральны будынак прыкметны здалёк. Яго ўпрыгожваюць калоны, арыгінальныя фігуры і дэталі. Многія будынкі маюць незвычайную форму. Усё гэта не выпадкова: прыйшоўшы ў тэатр, глядач павінен забыцца пра паўсядзённыя клопаты, акунуцца ў атмасферу свята.



Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы (г. Мінск, Беларусь)

Уздзеянне на эмацыянальны стан гледача працягваецца ў ***глядзельнай зале***. З любой яе кропкі адкрываецца від на ***сцэну***. Існуюць розныя



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Сцэна-каробка. Маскоўскі дзяржаўны акадэмічны дзіцячы музычны тэатр імя Н. І. Сац (Расія)

тыпы сцэны і спосабы размяшчэння гледачоў. Сцэна, якая з трох бакоў абмежавана сценамі і размяшчаецца перад глядзельнай залай у форме партэра з ярусамі, называецца сцэнай-каробкай. Сцэна, якую гледачы акружаюць з трох ці чатырох бакоў амфітэатрам, — сцэнай-арэнай.

**Партэ́р** (з фр. «на зямлі») — ніжні паверх глядзельнай залы.

У ***закуліснай частцы*** тэатра, якую глядач не бачыць, размяшчаюцца творчыя цэхі. У іх працуюць людзі розных прафесій: сталяры, слесары, зваршчыкі, швачкі… Менавіта тут, у закуліссі, нараджаюцца дэкарацыі, якія потым радуюць і захапляюць гледачоў.



Сцэна-арэна. Летні амфітэатр (г. Віцебск, Беларусь)



Праца над макетам да спектакля. Галоўны мастак Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы, народны мастак Беларусі, лаўрэат дзяржаўных прэмій СССР і Беларусі Барыс Герлава́н

Вобраз будучай пастаноўкі ствараецца паэтапна. Спачатку мастак малюе эскізы дэкарацый і робіць макет да спектакля. Гэта неабходна для таго, каб удзельнікі спектакля маглі загадзя ўявіць, як будуць выглядаць усе элементы афармлення ў прасторы сцэны. У натуральную велічыню дэкарацыі выконваюць у *дэкарацыйным цэху*.

**Эскі́з** — папярэдні накід ідэі.

**Маке́т** — паменшаная ў шмат разоў выява сцэны.

Для многіх спектакляў вырабляюць *бутафорыю* — несапраўдныя прадметы, якія маюць знешняе падабенства з арыгінальнымі. Старадаўнія кароны і кубкі, чарніліцы з пёрамі і зброю ствараюць у *бутафорскім цэху*. Бутафорскія прадметы дапамагаюць аўтару спектакля ярчэй паказаць эпоху і характар герояў, а акцёрам — раскрыць абставіны.



Сцэна са спектакля «Пінская шляхта». Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы (г. Мінск, Беларусь). У галоўнай ролі Віктар Мана́еў



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

У спектаклі «Пінская шляхта» драматурга Вінцэ́нта Ду́ніна-Марцінке́віча можна заўважыць велізарную бутафорскую залатую пячатку ў выглядзе двухгаловага арла. Яе памеры і форма падкрэсліваюць веліч суддзі — галоўнага героя п'есы. А яго машынка для рэзання паперы настолькі вялікая, што сваім грозным выглядам выклікае страх.

Тэатральныя бутафоры — майстры на ўсе рукі! Яны ствараюць прадметы з надзвычайнымі ўласцівасцямі, адрознымі ад рэальных. Напрыклад, зброя павінна быць бяспечнай, а ваза, якая разбіваецца на кожным спектаклі, павінна лёгка «збірацца» наноў. Для стварэння патрэбнага фону і атмасферы на сцэне таксама выкарыстоўваецца *рэквізіт* — прадметы інтэр'ера і побыту. Мэбля, посуд, упрыгажэнні, аксесуары знаходзяцца ў распараджэнні *рэквізітарскага цэху*.



Касцюмерная. Галоўны мастак Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа Святлана Мака́ранка

Касцюмы дзеючых асоб выконваюць на аснове эскіза мастака. Задума ўвасабляецца ў *пашывачным цэху*. Касцюмы розных гістарычных эпох ствараюцца з розных матэрыялаў — тканіны, поліэтылену, паперы. Старадаўнія сукенкі з раскошнымі дэкаратыўнымі элементамі ці шыкоўныя, расшытыя залатымі ніткамі кафтаны і сурдуты — усё падуладна рукадзельніцам пашывачнага цэху. Захоўваюць гатовыя касцюмы, галаўныя ўборы, абутак і даглядаюць іх у *касцюмерным цэху*.



Сцэна са спектакля «Віні-Пух і ўсе, усе, усе...». Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь (г. Мінск)

Завяршальныя штрыхі ў вобраз акцёра ўносіць грымёр. У *грымёрным цэху* выканаўцам наносяць грым. Пры

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Рэпетыцыя на сцэне Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Максіма Горкага (г. Мінск, Беларусь)

неабходнасці выкарыстоўваюцца парыкі, вусы, бароды, валасы. Сцэнічнае аблічча дзеючых асоб павінна быць яркім, выразным і дакладным.

Для атрымання сцэнічных эфектаў сцэна абсталявана спецыяльнымі асвятляльнымі прыборамі — разнастайнымі пражэктарамі з каляровымі фільтрамі, праекцыйнымі ўстаноўкамі. Майстры па святле «малююць» светлавую партытуру спектакля. Ім падуладныя яркае святло дня ці вячэрні змрок, казачныя адценні марскога дна і бліскание маланак на сцэне.

Свой «нябачны» бок стварэння сцэнічнага вобраза існуе і ў акцёраў. У спецыяльных *рэпетыцыйных залах* праходзіць складаная, карпатлівая праца. Пад кіраўніцтвам рэжысёра акцёры рэпеціруюць свае ролі. Для таго каб «пражываць» на сцэне розныя лёсы, ім патрэбна вялікая творчая самааддача. Акцёраў, якія здолелі сыграць незабыўныя ролі, называюць вялікімі.

Кожны новы спектакль і новы сцэнічны вобраз нараджаюцца толькі ў прысутнасці гледача ў глядзельнай зале. Глядач стварае *свой* вобраз дзякуючы актыўнаму ўдзелу ў спектаклі: уважліва назірае за падзеямі і перажывае за лёсы герояў.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

### Пытанні і заданні

1. Пералічыце памяшканні тэатра, пра якія вы даведаліся з параграфа. У якіх памяшканнях закуліснай часткі вам хацелася б пабываць?

2. Уявіце, што вам прапанавалі паўдзельнічаць у інсцэніроўцы любімага твора. Якой павінна быць роля вашага персанажа? Як ён павінен выглядаць, рухацца, жэстыкуляваць? Якія ў яго будуць асаблівасці маўлення?

### Творчая майстэрня

3. Уявіце, што вы журналіст і павінны ўзяць інтэрв'ю ў аднаго з работнікаў тэатра. Каго вы хацелі б апытаць? Чаму? Прыдумайце 5–7 пытанняў, якія вы хацелі б задаць.

Паглядзіце ў інфармацыйных крыніцах відэаэкскурсію «Па Купалаўскім тэатры з Мікалаем Пінігіным». Складзіце невялікае апавяданне пра адну з тэатральных прафесій.

## § 20. Музычны тэатр: опера і балет

*Музычны тэатр* — яшчэ адзін від тэатральнага мастацтва. Яго найбольш распаўсюджанымі жанрамі з'яўляюцца *опера* і *балет.*

Галоўным сродкам выразнасці ў музычным тэатры выступае *музыка*. Менавіта яна «кіруе» дзеяннямі герояў, дапамагае выразна перадаць настрой і характар персанажаў, іх стан. Таму пры стварэнні спектакля ў музычным тэатры асабліва вылучаецца роля кампазітара. Ён выбірае літаратурны твор, сюжэт якога стане асновай музычнага спектакля, нярэдка сам піша *лібрэта* да будучай пастаноўкі. Не выпадкова кампазітара ў музычным тэатры называюць *музычным драматургам*. На аснове лібрэта кампазітар стварае *партытуру* спектакля — нотны запіс музычнага твора.

**Лібрэ́та** (з іт. «кніжачка») — літаратурная аснова музычнага твора.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Николай Римский-Корсаков

**Снегурочка**

Опера в четырёх действиях с прологом

Либретто Н. А. Римского-Корсакова
(основанное на одноимённой пьесе А. Н. Островского)

**ПРОЛОГ**

*Начало весны. Полночь. Красная горка, покрытая снегом. Направо кусты и редкий безлистый березник; налево сплошной частый лес больших сосен и елей с сучьями, повисшими от тяжести снега. В глубине под горой река, полынь и проруби обсажены ельником. За рекой Берендеев посад, столица царя Берендея: дворец, дома, избы, все деревянные, с причудливой раскрашенной резьбой; в окнах огни. Полная луна серебрит всю открытую местность. Вдали кричат петухи. Леший сидит на сухом пне.*

**Леший**

Конец зиме; пропели петухи,
Весна-Красна спускается на землю;
сторожку леший отсторожил, —
ныряй в дупло и спи!

*Проваливается в дупло...*

У ***тэатры оперы*** акцёры разыгрываюць партытуру з дапамогай вакальнага мастацтва. У вакальных нумарах выканаўцы выражаюць пачуцці і эмоцыі герояў, іх узаемаадносіны і непаўторнае аблічча.

**О́пера** — гэта «драма, напісаная музыкай».

*Барыс Пакроўскі*

Сольныя вакальныя нумары ў оперы называюцца па-рознаму: а́рыя, арыёза, песня, каваці́на... Усе яны адрозніваюцца па форме і характары выканання, але падобныя ў галоўным — гэта вакальныя творы для аднаго голасу з акампанементам. Кожны з гэтых нумароў можна параўнаць з маналогам у драматычным тэатры. Толькі маналог прамаўляецца, а вакальныя нумары прапяваюцца. Гэта азначае, што ў мастацтве оперы акцёры не гавораць, а спяваюць! Майстэрства кампазітара заключаецца ў тым, каб у адным кароткім нумары паказаць усю глыбіню стану персанажа.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне





Сцэны з оперы «Снягурачка». Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь (г. Мінск)

У оперы «Снягурачка» кампазітара Мікалая Андрэевіча Ры́мскага-Ко́рсакава вобраз пяшчотнай, паэтычнай Снягурачкі праяўляецца ўжо ў самым пачатку — у арыі «З сяброўкамі па ягады хадзіць». Лёгкія, чароўныя музычныя інтанацыі Снягурачкі напоўнены свежасцю і цеплынёй. Мелодыя пераклікаецца з напевамі флейты, якая падкрэслівае вытанчанасць вобраза галоўнай гераіні.

Дыялог некалькіх оперных персанажаў — гэта вакальны ансамбль. Сваю назву ансамбль атрымлівае ў залежнасці ад колькасці «суразмоўцаў». Вакальны твор для двух герояў называецца дуэт, для трох — трыа, для чатырох — квартэт. У адрозненне ад дыялогу ў драматычным спектаклі, героі опернага вакальнага ансамбля могуць спяваць разам, адначасова.

У ***тэатры балета*** музычная партытура ўвасабляецца з дапамогай мастацтва *харэаграфіі*. Усе падзеі і дзеянні герояў, апісаныя ў лібрэта, «расказваюцца» з дапамогай рухаў. Асноўныя аўтары балета — *харэограф* і *балетмайстар*. Харэограф прыдумвае танец, а балетмайстар выбудоўвае харэаграфічныя нумары ў адпаведнасці з сюжэтам і музыкай, створанай кампазітарам. У балеце музыка і харэаграфія роўныя!

**Харэагра́фія —** мастацтва сцэнічнай пастаноўкі і выканання танца.

Танцавальныя нумары ў балеце, як і вакальныя нумары ў оперы, маюць свае назвы. Напрыклад, танец двух выканаўцаў называецца французскім словам «па-дэ-дэ», трох — «па-дэ-труа». Артысты, якія

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Сцэна з балета «Папялушка». Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь (г. Мінск)

выконваюць масавыя танцавальныя нумары, — гэта артысты кардэбалета.

У балеце харэаграфічнае мастацтва злучаецца з акцёрскім майстэрствам. Асабліва ярка гэта праяўляецца ў сучасных балетных спектаклях.

Напрыклад, у балеце «Папялушка» кампазітара Сяргея Сяргеевіча Пракоф'ева дзеянне перанесена ў пачатак 20 стагоддзя. Сёстры галоўнай гераіні — Злосніца і Крыўляка — грубыя і жорсткія. Выхаванкі балетнай студыі, яны мараць пакарыць сэрца Прынца на танцавальным конкурсе. Іх характар ярка праяўляецца ў танцаваль-



Сцэна з оперы «Аіда». Арэна дзі Верона (г. Верона, Італія)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

най пластыцы. Падкрэслена ўтрыраваныя, манерныя рухі і выразная міміка робяць вобразы сясцёр зразумелымі без слоў.

Музычны тэатр адрозніваецца відовішчнасцю, пышнасцю, багаццем фарбаў і маштабнасцю. Арыгінальнасць і выразнасць сцэнічнага ўвасаблення музычнага спектакля залежаць ад фантазіі і творчага ўяўлення *рэжысёра*. У садружнасці з мастаком ён ператварае вобразы, якія гучаць, у візуальныя. Увасобіць задуманае дапамагаюць выканаўцы — артысты.

Тэатр — гэта мастацтва дзеяння, музыка — мастацтва пачуццяў і эмоцый. У музычным тэатры адбываецца іх злучэнне. Дзякуючы гэтаму глядач не проста бачыць учынкі і дзеянні герояў. Ён «чуе» іх пачуцці, выражаныя ў музычнай інтанацыі, мелодыі, рытме, рухах...

### Пытанні і заданні

1. Назавіце асноўныя сродкі выразнасці ў тэатры оперы і балета. Ахарактарызуйце адзін з іх.

Паглядзіце на афіцыйным сайце Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь анонсы музычных спектакляў для дзяцей. Выберыце спектакль, на які вам хацелася б патрапіць. Растлумачце свой выбар.

### Творчая майстэрня

Паглядзіце ў інфармацыйных крыніцах фрагменты музычных спектакляў «Снягурачка» і «Папялушка». Апішыце вобразы абедзвюх гераінь. З дапамогай якіх сродкаў выразнасці музычнага тэатра ўвасоблены іх вобразы ў спектаклях оперы і балета?

2. Сюжэт якой са знаёмых вам кніг мог бы стаць асновай музычнага спектакля? Вырашыце, што гэта будзе — опера ці балет. Стварыце эскіз афішы да спектакля.

Азнаёмцеся з дадатковымі старонкамі на кампакт-дыску да раздзела «Тэатр бачны і нябачны». Выканайце заданні.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# Раздзел 6
# Кіно – дзясятая муза

У кіно кожны можа пра штосьці памарыць...

*Э́рых Мары́я Рэма́рк*



Кадр з фільма «Агні вялікага горада» (рэжысёр Ча́рлі Ча́плін)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

*Свет кіно — неверагодна цікавы і займальны. Ён хвалюе сэрцы людзей. Добрае кіно зачароўвае, здзіўляе, захапляе і ўражвае. Для многіх людзей прагляд любімага фільма — ні з чым не параўнальнае задавальненне, а часам і сапраўднае свята!*

*Разам з героямі фільма мы радуемся ці сумуем, трапляем у разнастайныя прыгоды, становімся сведкамі адвагі і мужнасці, ваюем за гонар і справядлівасць. Дзякуючы кінамастацтву мінулае і будучае ператвараюцца ў яркі зрокавы вобраз і ад гэтага становяцца больш блізкімі і зразумелымі.*

## § 21. Паходжанне кінамастацтва

Гісторыя кіно надзвычай цікавая. Пачалася яна задоўга да афіцыйнай даты яго нараджэння. А менавіта з дзіўнай здольнасці чалавека *назіраць* за навакольным светам і жадання любым спосабам *фіксаваць* самыя дробныя рухі людзей, прадметаў і з'яў гэтага свету.

Лічыцца, што першымі назіраннямі, якія паўплывалі на ўзнікненне кіно, былі *цені* людзей і прадметаў, якія агонь адкідаў на сцены пячоры. Полымя вогнішча адлюстроўвалася на навакольных прадметах. «Рухомыя» цені бязгучна і паслухмяна падпарадкоўваліся напрамку агню, нібы ў нямым кіно.



Тэатр ценяў

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Эфект ценяў і сёння выкарыстоўваецца ў многіх краінах. Шырока вядомы тэатр ценяў у Кітаі. З розных матэрыялаў (паперы, скуры) фокуснікі і артысты вырабляюць плоскія лялькі. Гледачы, якія знаходзяцца па другі бок экрана, бачаць не саміх лялек, а толькі іх цені.

Самым важным вынаходствам у гісторыі кіно стаў «чароўны ліхтар». Ён змяшчаў у сабе ўвесь тэатр ценяў і складаўся са знешняй абалонкі і крыніцы святла, напрыклад лампады ці электрычнай лямпы. Выявы фіксаваліся на пласцінах са шкла і нагадвалі сучасныя слайды. Калі прыглядзецца да формы «чароўнага ліхтара», можна заўважыць, што менавіта ён і з’яўляецца папярэднікам сучаснага кінапраектара.

Першы кінаапарат афіцыйна запатэнтавалі браты Люм’ер. З яго дапамогай 28 снежня 1895 года Луі́ і Агю́ст Люм’ер у Гранд-кафэ на бульвары Капуцынак у Парыжы прадэманстравалі свае фільмы. У той дзень і быў пакладзены пачатак кіно як новага віду мастацтва!

Першыя фільмы братоў Люм’ер былі кароткія — каля 50 секунд. Самым папулярным быў фільм «Паліты палівальшчык». Гэта гісторыя



«Чароўныя ліхтары»


Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Кадр з фільма «Паліты палівальшчык» (рэжысёры Луі і Агюст Люм’ер)

пра тое, як хлопчык, стоячы за спінай садоўніка, які палівае кветкі, наступае на шланг з вадой. Затым хлопчык рэзка прыбірае нагу са шланга, і садоўнік нечакана аблівае сябе. Простая гісторыя, расказаная з дапамогай новых мастацкіх сродкаў, выклікала ашаламляльную цікавасць.

На кінапаказе братоў Люм’ер пабываў вядомы ілюзіяніст Жорж Мельéс. Фільмы здаліся яму сумнымі і аднастайнымі. Таму ён звярнуў увагу на забаўляльны бок кіно — трукі і спецэфекты. У фантастычным фільме «Вандроўка на Месяц» ён выкарыстоўваў новыя прыёмы: стоп-кадр і запаволеныя здымкі. У сучасным кіно гэтыя эфекты звыклыя. Але многія рэжысёры вучыліся і дагэтуль вучацца ў Жоржа Мельеса, менавіта ім прыдуманыя эфекты выкарыстоўваюць у сваіх фільмах.



Кадр з фільма «Вандроўка на Месяц» (рэжысёр Жорж Мельес)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Прыклад старонак «чароўнага» нататніка

Спробы «злавіць» рух працягваюцца і сёння. Самы просты прыклад — «чароўны» нататнік. На яго старонках малююць фігурку чалавека ці жывёлы. На кожнай новай старонцы — новы рух фігуркі, напрыклад тулава ці рукі. Калі хутка прагартаць старонкі нататніка, ствараецца ілюзія руху фігуркі — як быццам фрагмент фільма.



Кадр з фільма «Малыш» (рэжысёр Чарлі Чаплін)

Кіно без гуку называлі *нямым*. Адным з самых знакавых у нямым кіно стаў вобраз Валацугі (рус. *Бродяги*). Яго стварыў і сыграў вядомы рэжысёр і акцёр Чарлі Чаплін. Гэты на дзіва кранальны і адначасова смешны герой імгненна стаў папулярным.

*Гук* у кіно з’явіўся толькі праз 30 гадоў пасля першага кінасеанса братоў Люм’ер.

Але асабліва цікавая гісторыя з’яўлення ў кіно *колеру*. У першых каляровых фільмах плёнку размалёўвалі ўручную. Амерыканскі фільм-казка «Чараўнік краіны Оз» пачынаецца з чорна-белых кадраў. Затым нечакана выява становіцца каляровай. Гэта зроблена для ўзмацнення кантрасту паміж рэальным светам дзяўчынкі Элі і светам фантастычным, у які яна трапляе.

 Правообладатель Адукацыя і выхаванне

 

Кадры з фільма «Чараўнік краіны Оз» (рэжысёр Віктар Фле́мінг)

Гісторыя кіно — гэта гісторыя арыгінальных ідэй, вынаходстваў і тэхнічных прылад. Даведваючыся пра іх, мы крок за крокам набліжаемся да разгадак свету кіно.

АДУКАЦЫЯ ВЫХАВАННЕ

### Пытанні і заданні

Паглядзіце ў інфармацыйных крыніцах фільмы братоў Люм'ер «Паліты палівальшчык» і «Выхад рабочых з фабрыкі Люм'ер». Параўнайце сюжэты фільмаў.

Паглядзіце ў інфармацыйных крыніцах фрагмент фільма Ж. Мельеса «Вандроўка на Месяц». Знайдзіце ў ім некалькі спецэфектаў. Раскажыце пра адзін з іх.

### Творчая майстэрня

1. Паспрабуйце зрабіць «чароўны» нататнік самастойна. Для гэтага неабходна набыць невялікі нататнік (не больш за 15 см у вышыню), намаляваць у правым ніжнім кутку кожнай старонкі фігурку чалавека ці жывёлы ў новай фазе руху, сагнуць нататнік і вялікім пальцам хутка прагартаць усе старонкі. Што ў вас атрымалася?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 22–23. Гульнявое (мастацкае) кіно

Мастацкае кіно — адзін з самых папулярных відаў мастацтва. Сёння мастацкае кіно часта называюць гульнявым (ад слова «гульня»).

Першы мастацкі фільм назваць цяжка. Некаторыя даследчыкі перакананы, што гэта фільм «Паліты палівальшчык» братоў Люм’ер. А некаторыя першым мастацкім фільмам лічаць «Вялікае абрабаванне цягніка». У ім мы знаёмімся з кароткім, але яркім апаведам.



Кадр з фільма «Вялікае абрабаванне цягніка» (рэжысёр Э́двін По́ртэр)

Рабаўнік цягніка паварочваецца ў бок гледача і страляе ў тых, хто яго пераследуе. Узнікае нечаканы эфект стрэлу ў глядзельную залу. Многія людзі хадзілі на кінасеанс толькі для таго, каб паглядзець гэты фрагмент і зноў адчуць «страх і жах».

Першы беларускі фільм «Лясная быль» стварыў у 1926 годзе Юрый Віктаравіч Та́рыч па аповесці Міхася Чарота «Свінапас». Галоўны герой фільма нагадвае быліннага персанажа. Ён увесь час трапляе ў цяжкія сітуацыі, але з лёгкасцю іх пераадольвае. Фільм «Лясная быль» зняты ў беларускай вёсцы Прылу́кі ў вядомай сядзібе графа Ча́пскага. Акцёрамі былі звычайныя людзі, якія ігралі саміх сябе.




Афіша да фільма «Лясная быль»

Стварэнне мастацкага фільма — працяглы працэс. Пачынаецца ён з задумы — *ідэі*. Напрыклад, ідэі стварыць станоўчага ці адмоўнага героя. Аўтарам ідэі фільма можа стаць кожны чалавек. Але прапанаваць штосьці сапраўды новае і цікавае надзвычай складана. Жорж Мельес здымаў свае фільмы па творах вядомага пісьменніка-фантаста Жу́ля Ве́рна. Ідэю для фільма


Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Палац Святаполк-Чацвярцінскіх (г. п. Жалуд́ок, Беларусь) — замак у фільме «Кіндэр-Вілейскі прывід»

«Паліты палівальшчык» браты Люм’ер запазычылі з коміксаў.

**Ко́мікс** — гісторыя, расказаная ў малюнках.

Карціна беларускага рэжысёра Алены Віктараўны Ту́равай «Кіндэр-Вілейскі прывід» знята па сюжэце навелы О́скара Уа́йльда «Кентэрві́льскі прывід». Аўтары фільма «перанеслі» падзеі, апісаныя ў навеле, з англійскага замка Ке́нтэрвіль на тэрыторыю Вілейскага раёна нашай краіны. Здымалі фільм у старадаўнім асабняку, размешчаным у Гродзенскай вобласці.

На аснове ідэі фільма пішацца *сцэнарый*. Гэта літаратурны твор, у якім паслядоўна выкладаюцца сюжэтныя лініі, раскрываюцца характары герояў, распрацоўваюцца дыялогі. Асноўнае патрабаванне да *сцэнарыста* — зрабіць сцэнарый займальным і цікавым. Чым больш дэтальна ён прадуманы, чым ярчэйшыя дыялогі персанажаў, тым лепшы будзе фільм.

**Сцэна́рый** — літаратурная аснова фільма.

Адной з галоўных фігур на здымачнай пляцоўцы з’яўляецца *рэжысёр*. Ён адказвае за мастацкае ўвасабленне задумы на экране, кіруе кінапрацэсам і ўсімі службамі. А таксама дае каманды «Камера!» ці «Знята!».

Пакуль вядзецца праца над сцэнарыем, рэжысёр і мастак рыхтуюць *раскадроўку*. *Мастак* замалёўвае кожную сцэну (ці эпізод) фільма на асобным аркушы паперы ў адпаведнасці са сцэнарыем. Атрымліваецца незвычайна доўгі комікс. Раскадроўка дапамагае

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Прыклад раскадроўкі з фільма «Кіндэр-Вілейскі прывід»

зразумець, *як* трэба распавядаць гісторыю, *як* данесці да гледача галоўную ідэю фільма і *якімі* павінны быць персанажы. Малюнак «расказвае» значна больш, чым словы.

**Раскадро́ўка** — фільм у малюнках.

Вельмі важны пры стварэнні фільма этап падбору *акцёраў* для галоўных, другарадных і эпізадычных роляў. Праца рэжысёра з акцёрам — адказны працэс. Рэжысёр ставіць задачу, а акцёр гэту задачу імкнецца выканаць.

Для кожнага героя распрацоўваецца эскіз *касцюма*. *Мастак па касцюмах* стварае вобраз героя і вобраз кінакарціны ў цэлым. Дэталі адзення дазваляюць зразумець характар персанажа і эпоху, у якой ён



Рэжысёр тлумачыць актрысе задачу



Рэжысёр працуе з акцёрам-трусам



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Праца касцюмераў



Праца грымёра

жыве. Самыя складаныя касцюмы выкарыстоўваюцца ў гістарычных і навукова-фантастычных фільмах.

Вобраз героя завяршае *грым*. Стварэнне грыму патрабуе вялікага майстэрства і фантазіі. У некаторых выпадках *грымёр* працуе некалькі гадзін.

Фільм «Кіндэр-Вілейскі прывід» (фрагмент) (рэжысёр Алена Турава)

Усе падзеі з дапамогай камеры фіксуе *аператар*. Ён адказвае за выяву ў будучай кінастужцы: як будзе зняты герой ці падзея, якімі будуць асвятленне і колер.

Адна з важных для кожнага рэжысёра традыцый — разбіць талерку на поспех! Гэта адбываецца пасля здымак першага плана. Асколкі



Праца аператара



Алена Турава ў першы здымачны дзень

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

талеркі члены здымачнай групы падбіраюць і доўга захоўваюць. Многія захоўваюць іх да канца здымак, а рэжысёр — на працягу ўсяго жыцця.

Веданне асноўных этапаў стварэння мастацкага фільма дапаможа стаць больш граматнымі гледачамі і лепш зразумець задуму кінакарціны.

**Пытанні і заданні**

1. Назавіце мастацкі фільм, які вам запомніўся. Раскажыце аднакласнікам чаму.

Паглядзіце ў інфармацыйных крыніцах мультфільм Ф. С. Хітрука «Фільм, фільм, фільм». Пра якія кінапрафесіі расказвае аўтар? Складзіце вуснае апавяданне пра адну кінапрафесію.

**Творчая майстэрня**

2. Выканайце раскадроўку асноўных падзей знаёмай вам байкі (апавядання, фільма) на 3–5 малюнках. Абмяркуйце праект з аднакласнікамі. Раскажыце, у чым заключалася асноўная складанасць выканання раскадроўкі.

## § 24–25. Асаблівасці кінамовы

Кіно як від мастацтва мае свае сродкі мастацкай выразнасці. З іх дапамогай аўтары імкнуцца данесці да гледача задуму фільма.

Настройваючыся на сустрэчу з кінакарцінай, глядач у першую чаргу рыхтуецца *глядзець*. Менавіта глядзець, а не слухаць. Гэта значыць, што важным сродкам выразнасці з'яўляецца *выява*. Чалавек ва ўсе часы спрабаваў захаваць свае назіранні на камені, драўлянай дошчачцы, папірусе, паперы... Думаў



Наскальны жывапіс



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

пра тое, *што* намаляваць, *як* размясціць намаляваныя прадметы і зрабіць малюнак больш выразным. Ствальнікі фільмаў таксама задумваюцца менавіта над гэтымі пытаннямі: *што* здымаць і *як* зрабіць зняты матэрыял выразным?

Не кожная гісторыя можа стаць асновай фільма. Не кожнае апавяданне ці аповесць можна экранізаваць. Па-сапраўднаму цікавыя гісторыі — тыя, у якіх шмат дзеяння. Чым больш у іх нечаканых паваротаў сюжэта і падзей, тым ярчэйшае кіно. Прыдумайце добрае апавяданне, насычанае цікавымі падзеямі, — і вы можаце лічыць сябе сцэнарыстам!

Такую гісторыю можна не толькі расказаць, але і намаляваць. А гэта значыць, што па ёй можна і зняць кіно. Не выпадкова настолькі папулярныя фільмы, знятыя па коміксах. Кожны малюнак комікса — гэта асобны кадр, у якім зафіксаваны персанаж і яго дзеянне. Гэта можа быць адна фаза руху, напрыклад фаза скачка, ці яркае праяўленне эмоцый — радасці, здзіўлення, страху.

На дзейсны бок кіно мы звяртаем увагу ў першую чаргу. Пераказваючы сюжэт прагледжанага фільма, расказчык апіраецца на галоўныя падзеі, у якіх вылучае і апісвае ўчынкі герояў.

**Манта́ж** — паслядоўнае злучэнне асобных кадраў фільма.

Дзеянне ў кіно шмат у чым залежыць ад такога сродку выразнасці, як *мантаж*. Кожны кадр — гэта адна падзея. Некалькі





Кадры з фільма «Марозка» (рэжысёр Аляксандр Роу)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

злучаных паміж сабой кадраў — гэта ўжо фільм. Змяняючы характар і паслядоўнасць кадраў, можна цалкам змяніць сюжэт кінагісторыі.

**Кадр** — здымак, на якім зафіксавана адна фаза руху.



Давайце ўявім, што чалавек чакае аўтобус на працягу адной гадзіны. Сродкамі мантажу гэта можна паказаць усяго за 30 секунд. У першым кадры фіксуем першае імгненне чакання, а ў другім — апошняе. Час на экране для гледача пралятае незаўважна. Так з дапамогай мантажу доўгую гісторыю можна зрабіць кароткай, сумную — вясёлай, невыразную — выразнай і цікавай. А фільм — яркім, дынамічным і запамінальным.

Важныя сродкі выразнасці ў кіно — *колер* і *святло*. Колеравая гама і асвятленне дапамагаюць улавіць драбнюткія дэталі падзей, якія адбываюцца на экране. У фільме «Горад майстроў» рэжысёр Уладзімір Сяргеевіч Бычко́ў асаблівую ўвагу надаў выяве. Цёплыя і халодныя тоны падказваюць гледачу асаблівасці ўзаемаадносін герояў — прыгажуні Веранікі і герцага дэ Малікóрна. Арыгінальны грым акцёра, які выконвае ролю герцага, дае яшчэ адну падказку. Ён падкрэслівае вераломны характар персанажа. Закаханы ў Вераніку, герцаг змятае на сваім шляху ўсе перашкоды, кожны дзень знаходзіць новыя спосабы, як заваяваць яе сэрца.



Кадр з фільма «Горад майстроў» (рэжысёр Уладзімір Бычкоў)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Кадр з фільма «Горад майстроў» (рэжысёр Уладзімір Бычкоў)

Вялікую ролю ў кіно мае *гук* — маўленне, музыка, гукавыя эфекты. Кінамузыка ўзмацняе эмацыянальнае ўздзеянне фільма на гледача. Гэта могуць быць песні, класічная ці эстрадная музыка. Галоўны герой фільма «Горад майстроў» Карако́ль — добры і чулы юнак, які выратаваў горад ад герцага дэ Малікорна, — выконвае дзівосную песеньку. Яна напісана ў духу старадаўніх балад і акунае гледача ў атмасферу Сярэднявечча.

Фільм «Горад майстроў» (фрагмент) (рэжысёр Уладзімір Бычкоў)

Стварыць атмасферу старадаўняга горада дапамагаюць і *дэкарацыі* фільма. Дэталі дэкарацый для гістарычных фільмаў распрацоўваюцца па старажытных рукапісах, газетах, кнігах, часопісах. Карпатліва ўзнаўляюцца дамы, помнікі архітэктуры, асобныя памяшканні. Нават невялікая памылка дэкаратара можа разбурыць атмасферу фільма. Для ўзмацнення праўдзівасці некаторыя сцэны фільма «Горад майстроў» здымаліся ў натуральных дэкарацыях, ля сцен манастыра Святой Брыгіты ў эстонскім горадзе Таліне.

**Кінаму́зыка** — музычнае суправаджэнне фільма.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Кадр з фільма «Кінг-Конг» (1933) (рэжысёр Ме́рыян Ку́пер)



Кадр з фільма «Кінг-Конг» (2005) (рэжысёр Пі́тэр Джэ́ксан)

**Спецэфе́кт** — прыём, які выкарыстоўваецца для здымак сцэн, якія не магчыма зняць звычайным спосабам.

Вялікую ролю ў ператварэнні фантазіі аўтара фільма ў рэальнасць маюць *спецэфекты*. Першыя спецэфекты з’явіліся адначасова з нараджэннем кіно. Паскораныя ці запаволеныя здымкі, знакаміты стоп-кадр Жоржа Мельеса... Сучасныя спецэфекты — гэта складаныя прыёмы стварэння персанажаў ці дэкарацый. Касмічныя караблі, дыназаўры, лялечныя персанажы, гістарычныя атрыбуты, створаныя з дапамогай камп’ютарнай тэхнікі, становяцца больш эфектнымі і дакладнымі.

Сапраўднае кіно аб’ядноўвае выразныя сродкі розных відаў мастацтва. Ведаючы іх асаблівасці, мы зможам не толькі зразумець ідэю фільма, але і ўбачыць, якім чынам аўтары здолелі данесці яе да гледача.

**Пытанні і заданні**

1. Назавіце 1–2 фільмы, знятыя на аснове літаратурных твораў.
2. У якіх фільмах вам асабліва запомніліся дэкарацыі? Чаму?


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Паглядзіце на кампакт-дыску фрагмент фільма У. С. Бычкова «Горад майстроў» і ў інфармацыйных крыніцах фрагмент фільма Г. Э. Ю́нгвальд-Хільке́віча «Вышэй за вясёлку». Праслухайце ў інфармацыйных крыніцах музыку з абодвух фільмаў. Растлумачце, як кінамузыка спалучаецца з выявай.

**Творчая майстэрня**

3. Прыдумайце арыгінальную гісторыю (5–6 сказаў) на аснове цікавага (смешнага) выпадку, які адбыўся з вамі. Як вы думаеце, ці можна па гэтай гісторыі зняць фільм? Растлумачце свой адказ.

## § 26. Анімацыйнае кіно

Мультфільмы — адзін з відаў кінамастацтва. Яны заслужылі любоў і шчырае прызнанне як у дзяцей, так і ў дарослых.

**Мультыплiка́цыя** — множанне выяў.

У сучаснай культуры мультыплікацыйнае кіно часцей называюць «анімацыйнае кіно». Гэта звязана з тым, што спосабы і тэхнічныя прыёмы стварэння фільма ў канцы 20 стагоддзя сталі больш разнастайнымі. Анімацыя — не проста множанне некалькіх выяў. Перш за ўсё гэта адушаўленне любога прадмета, нават самага незвычайнага.

Анімацыйнае кіно з'явілася раней, чым гульнявое. У 1892 годзе ў Францыі вынаходнік Эмі́ль Рэйно́ прадэманстраваў невялікія фільмы, якія атрымалі назву «пантамімы, што свецяцца». Аўтар сам маляваў і размалёўваў сваіх герояў — клоўнаў, канькабежцаў, школьнікаў, а затым паказваў іх на сваім апараце. Многія прыёмы Э. Рэйно ляглі ў аснову мастацтва анімацыі.

**Анiма́цыя** — адушаўленне, ажыўленне.

Першага яркага намаляванага персанажа стварыў французскі мастак Эмі́ль Коль. У яго фільме «Фантасмаго́рыя» з'явіўся смешны, але выразны герой «фанто́ш», які адразу спадабаўся гледачам.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Кадр з анімацыйнага фільма «Бедны П’еро» (рэжысёр Эміль Рэйно)



Кадр з анімацыйнага фільма «Фантасмагорыя» (рэжысёр Эміль Коль)

Многія знаходкі Э. Коля — фантастычныя ператварэнні, людзі і рэчы, якія лётаюць, мікробы, што ажываюць, — у наступныя дзесяцігоддзі з задавальненнем выкарыстоўвалі іншыя аніматары.

Заснавальнікам савецкай анімацыі стаў рэжысёр Іван Пятровіч Іваноў-Вано. Дзякуючы яму з 1927 года сталі з’яўляцца фільмы для дзяцей.

Работы І. П. Ивано́ва-Вано́ адразу ўразілі аўдыторыю. У якасці выяўленчага матэрыялу ў фільме «Поры года» аўтар выкарыстоўваў прадметы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Шырока прадстаўлены гліняны посуд, карункі, роспісы, арнамент. У фільме «Казка пра мёртвую царэўну і сем волатаў» асновай выявы сталі палотны В. М. Васняцова.

Анімацыйны фільм «Сеча пры Ке́ржанцы» І. П. Іваноў-Вано стварыў сумесна са сваім вучнем Юрыем Барысавічам Нарштэ́йнам. У анімацыйнай фантазіі на музыку М. А. Рымскага-Корсакава аўтары выкарыстоўваюць рускі іканапіс 15–16 стагоддзяў.



Кадр з анімацыйнага фільма «Казка пра мёртвую царэўну і сем волатаў» (рэжысёр Іван Іваноў-Вано)

Заснавальнікам лялечнай анімацыі лічаць Уладзіслава Аляксандравіча Старэ́віча. Персанажы


Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Кадр з анімацыйнага фільма «Сеча пры Кержанцы»
(рэжысёры Іван Іваноў-Вано, Юрый Нарштэйн)

яго фільмаў «Жыццё стракоз», «Страказа і мурашка» — дакладныя копіі насякомых. Напачатку 20 стагоддзя тэхніка ажыўлення герояў настолькі здзівіла гледачоў, што пасля дэманстрацыі фільмаў У. А. Старэвіча ўражаныя журналісты пісалі пра дрэсіраваных жукоў!

Героямі лялечных фільмаў могуць стаць самыя нечаканыя прадметы — цвікі, іголкі, запалкі, вяроўка. У філасофскай прытчы «Ада́жыа» расійскага рэжысёра Га́ры Ба́рдзіна апавядаецца пра складаны шлях пошуку новых ідэй. Персанажы фільма створаны



Кадр з анімацыйнага фільма «Страказа і мурашка» (рэжысёр Уладзіслаў Старэвіч)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Кадр з анімацыйнага фільма «Адажыа» (рэжысёр Гары Бардзін)

ў тэхніцы арыгамі з паперы светлых і цёмных адценняў, якія ўвасабляюць сілы, што супрацьстаяць адна адной. Музыка знакамітага «Адажыа» італьянскага кампазітара Тама́за Альбіно́ні ўзмацняе эмацыянальнае напружанне гледача і дапамагае яму зразумець сэнсавыя лініі фільма.

Свая гісторыя і ў беларускай анімацыі. Многія фільмы, створаныя на кінастудыі «Беларусьфільм», адзначаны ўзнагародамі на міжнародных фестывалях.

Беларускі рэжысёр-аніматар Ігар Віктаравіч Во́лчак стварыў некалькі ўнікальных праектаў. Адзін з іх — поўнаметражны анімацыйны фільм «Прыгоды Несцеркі», зняты па матывах беларускіх народных казак. Галоўны герой — добры знаходлівы Несцерка — разам са сваімі сябрамі сабакам і катом увесь час трапляе ў складаныя сітуацыі.



Кадр з анімацыйнага фільма «Прыгоды Несцеркі» (рэжысёр Ігар Волчак)

Дзівосныя калядныя гісторыі расказала ў сваіх фільмах рэжысёр Ірына Валянцінаўна Кадзюко́ва. Калядныя святы — дванаццаць студзеньскіх дзён ад Вялікадня да Вадохрышча. У гэтыя светлыя дні



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Кадр з анімацыйнага фільма «Дзяўчынка з запалкамі» (рэжысёр Ірына Кадзюкова)

людзі робяць добрыя ўчынкі. Некалькі гісторый пра дабрату, чалавекалюбства і міласэрнасць леглі ў аснову анімацыйнага цыкла І. В. Кадзюковай «Калядныя апавяданні».

Фільм «Дзяўчынка з запалкамі» зняты па матывах казкі Х. К. Андэрсэна. Напярэдадні Каляд людзі праходзяць міма дзяўчынкі, якая прадае запалкі. Каб сагрэцца, гераіня фільма спальвае адну запалку за другой. У нейкі момант запалкі заканчваюцца… Душа дзяўчынкі, нібы душа анёла, імкнецца да кожнага гледача, змякчаючы сэрцы, заклікаючы да міласэрнасці і спачування.

Абаяльныя героі сустракаюць гледача ў анімацыйным фільме Таццяны Васільеўны Кублі́цкай «Песня Жаваранка». У аснове сюжэта фільма — аднайменная казка Леаніда Аляксандравіча Ула́шчанкі пра дзіўныя песні Жаваранка, якімі ён сустракае прыход вясны. У знаёмыя вобразы беларускай прыроды — пралесак, ляснога





Кадры з анімацыйнага фільма «Песня Жаваранка» (рэжысёр Таццяна Кубліцкая)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Праца над вобразам у анімацыйным фільме «Песня Жаваранка» (рэжысёр Таццяна Кубліцкая)

ручайка — арганічна ўплятаецца арыгінальная музыка. Лёгкая кранальная песенька ў выкананні беларускага школьніка завяршае вобраз і галоўнага героя, і мультфільма ў цэлым.

Стварэнне мультыплікацыйнага персанажа — працэс складаны. У першую чаргу распрацоўваецца вобраз героя ў адпаведнасці з яго характарам, апісаным у сцэнарыі. Вобраз героя — гэта своеасаблівы партрэт, у якім заяўлены характар персанажа. Мастак робіць простыя замалёўкі персанажа ў некалькіх варыянтах, і вобраз паступова ажывае. З'яўляюцца толькі яму ўласцівыя асаблівасці — рухі, міміка, жэсты… Персанаж паслядоўна і скрупулёзна дапрацоўваецца, ствараюцца спецыяльныя аркушы ўзораў аблічча героя з розных бакоў. Толькі пасля гэтага аўтары ствараюць каляровую мадэль персанажа.

Героі мультфільмаў увайшлі амаль у кожны дом. Мы пазнаём іх па голасе, рэпліках, песнях. З іх дапамогай мы знаёмімся з казкамі, баснямі, вершамі, апавяданнямі. Побач з імі мы радуемся і сумуем. Разам з імі мы спазнаём свет!

### Пытанні і заданні

Паглядзіце ў інфармацыйных крыніцах 2–3 анімацыйныя фільмы, прадстаўленыя ў параграфе. Якое ўражанне зрабілі на вас фільмы?

Анімацыйны фільм «Песня Жаваранка» (рэжысёр Таццяна Кубліцкая)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Уважліва паглядзіце ў інфармацыйных крыніцах анімацыйны фільм «Прыгоды Несцеркі» рэжысёра І. В. Волчака. Якую ўзнагароду за свае ўчынкі атрымаў галоўны герой?

### Творчая майстэрня

1. Складзіце вуснае паведамленне на тэму «Мае любімыя мультыплікацыйныя героі». Падрыхтуйце прэзентацыю з выявамі персанажаў у даступнай камп'ютарнай праграме.

2. У некалькі этапаў выканайце праект на тэму «Новы мультыплікацыйны герой». Намалюйце эскіз вобраза новага героя (па матэрыялах казкі, байкі, апавядання і інш.). Стварыце аркуш, на якім герой будзе паказаны ў розных ракурсах. Намалюйце яго ў колеры. Раскажыце аднакласнікам пра героя, які атрымаўся.

Азнаёмцеся з дадатковай старонкай на кампакт-дыску да раздзела «Кіно — дзясятая муза». Выканайце заданні.

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# Раздзел 7
# Мастацтва «на кончыках пальцаў»

Камп'ютар можа рэалізаваць многія задумы. Але дапамагае ён толькі тады, калі ты ведаеш, *што* менавіта ад яго хочаш.

*Валерый Вядрэ́нка*



**Аляксандр Маруно́ў.** Зімовы пейзаж

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

*Для стварэння жывапіснага палатна, літаратурнага ці музычнага твора аўтару заўсёды неабходны розныя прылады. Мастаку — алоўкі, пэндзлі, фарбы. Кампазітару — музычны інструмент. Архітэктару — чарцёжныя прылады…*

*Са з'яўленнем тэхнічных навінак адкрываюцца ўсё шырэйшыя магчымасці для таго, каб ствараць непаўторныя творы. Змяняецца і само ўяўленне пра мастацтва, пашыраецца палітра відаў мастацкай творчасці.*

*Але тэхнічнае прыстасаванне само па сабе не здольна стварыць твор мастацтва. Як бы там ні было, ім кіруе чалавек. Менавіта ён — творца!*

## § 27–28. Фатаграфія як від мастацтва

У сучасным свеце нас акружае мноства фатаграфій. На вуліцах гэта рэкламныя выявы, у тэатрах і на выставах — фотаафішы, дома — фотаздымкі блізкіх нам людзей і цікавых падзей.

Часта мы фатаграфуем самі. Убачыўшы нешта незвычайнае, сучасны чалавек імкнецца зафіксаваць свае назіранні — зняць іх на фотакамеру. Яшчэ больш мы любім пазіраваць перад камерай. Для нас мае значэнне не толькі цікавая падзея, але і наша прысутнасць у ёй.



**Жозэф Ньепс.**
Від з акна ў Ле Гра

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Сёння фатаграфія прымяняецца амаль ва ўсіх абласцях жыццядзейнасці чалавека. Здымкі патрэбныя для фіксацыі вынікаў навуковых доследаў. Яны дапамагаюць нам даведацца пра падзеі, якія адбываюцца ў свеце. Любая інфармацыя, дапоўненая фатаграфіямі, становіцца больш яркай і выразнай. Менавіта таму без здымкаў не абыходзяцца газеты, часопісы, кіно, тэлебачанне.

**Фатагра́фія** — стварэнне і захаванне статычнага малюнка пры дапамозе камеры.

Паняцце «фатаграфія» паходзіць ад двух грэчаскіх слоў — «святло» і «пішу». Святло пранікае праз адтуліну аб'ектыва ў цёмную прастору камеры, трапляе на адчувальную паверхню, аб'ектыў закрываецца і — выява захоўваецца. Яна «запісваецца» пры дапамозе святла за той кароткі перыяд, пакуль быў адкрыты аб'ектыў. Не выпадкова гэты працэс параўноўваюць з працай чалавечага вока. Зрэнка — гэта аб'ектыў. Святло трапляе на сятчатку вока, а мозг запамінае і апрацоўвае выяву.



Фотаапарат Жозэфа Ньепса (музейны экспанат)

Даследчыкі лічаць, што першы фотаздымак зрабіў у 1822 годзе французскі вынаходнік Жо́зэф Нісефо́р Ньепс. Гэта было амаль 200 гадоў таму! Ён сфатаграфаваў від з акна свайго кабінета на алавяную пласцінку, пакрытую вельмі тонкім слоем бітуму[2], і так захаваў выяву. Для гэтага яму спатрэбілася цэлых 8 гадзін пры яркім святле!

**Фотака́мера** — устройства для атрымання фатаграфій.

Першы каляровы здымак стварыў англійскі навуковец Джэймс Клерк Ма́ксвел. Ён сабраў адну выяву з трох здымкаў рознага колеру — зялёнага, сіняга і чырвонага — і дэманстраваў яго на спецыяльным экране

[2] Бі́тум — з лац. «горная смала, нафта».



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

з падсветкай. А ўжо дзякуючы братам Люм’ер каляровая фатаграфія стала масавай.

Фатаграфіі Ж. Ньепса і Д. Максвела наўрад ці здзівяць сучаснага гледача. Каштоўнасць іх работ у тым, што яны былі першымі.

Паступова фатографы сталі разумець, што атрыманыя імі выявы — гэта не толькі спосаб фіксацыі прадметаў і з’яў навакольнага свету. Фатаграфіі можна зрабіць прыгожымі, як, напрыклад, жывапісныя карціны. Для гэтага фатографы хутка пераймалі ў мастакоў асноўныя законы выяўленчага мастацтва: прынцыпы пабудовы кампазіцыі, прыёмы перадачы святлаценю і перспектывы і г. д. Так людзі навучыліся ствараць не проста фатаграфіі, а творы фотамастацтва.

З часам фотакамера перастала быць заменай пэндзля мастака. Фатаграфія вылучылася ў самастойную сферу мастацтва.



**Джэймс Максвел.**
Трохкаляровы бант



**Леў Дашкéвіч.**
Партрэт жонкі

**Фотамастáцтва** — мастацтва стварэння мастацкай фатаграфіі.



**Сяргей Пракýдзін-Гóрскі.**
Віцебск. Успенскі сабор

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Філіп Халсман.** Сальвадор Далі з кошкамі

Вядомы фатограф 20 стагоддзя Фі́ліп Ха́лсман стварыў унікальную серыю «Скачок». Адна з самых яркіх работ — партрэт іспанскага мастака Сальвадо́ра Далі́, які здзяйсняе скачок. Да здымак доўга рыхтаваліся. У выніку на здымку адлюстраваны не толькі мастак. У скачку зафіксаваны крэслы, мальберт, карціны. Асаблівую відовішчнасць фотапартрэту надаюць кошкі, якія скачуць, і знятая быццам «у скачку» вада.

Важная ўласцівасць фатаграфіі — яе дакладнасць. Тое, што мы бачым на здымку, сапраўды існавала ў момант здымак — у рэальнасці, а не ў фантазіі аўтара. У драбнюткіх дэталях фатограф «расказвае» нам пра навакольны свет. Вядома, ён можа ўпрыгожыць і перайначыць рэчаіснасць з дапамогай спецыяльных тэхнічных прыёмаў. Але галоўны аб’ект здымак не выдуманы, а рэальны. І калі пры гэтым на фатаграфіі майстру атрымліваецца перадаць эмоцыі, настрой, вобраз, яна становіцца мастацкай.

Сучасны беларускі фотамастак Віктар Васільевіч Малы́шчыц рэалізаваў унікальны праект «Беларусь у абдымках зорак». Ён стварыў фатаграфіі помнікаў беларускай архітэктуры на фоне начнога неба. Дзякуючы мастацтву майстра наша краіна паўстае перад гледачом у новым, рамантычным абліччы.


Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Віктар Малышчыц.** Троіцкі касцёл (в. За́свір, Беларусь)

**С. М. Пракудзін-Горскі.** Фатаграфіі Мінска, Віцебска, Полацка пачатку 20 стагоддзя.

**Я. Бу́лгак.** Касцёл Праабражэння Гасподняга (г. Навагрудак, Беларусь)

З дапамогай сучаснай тэхнікі можна стварыць самыя розныя фатаграфіі. Напрыклад, паказаць рух, як гэта зрабіў Ф. Халсман. Ці выхапіць з рэальнасці ўнікальныя імгненні, як на фотаздымку В. В. Малышчыца. Тэхніка стварэння фатаграфій бесперапынна рухаецца наперад, але кожны, хто трымае камеру ў руках першы раз, проста здымае тое, што бачыць перад сабой, напрыклад від з акна.

Многія фатографы раўнадушна фіксуюць рэчаіснасць. Некаторыя — перайначваюць яе. Але і тыя і другія дапамагаюць чалавеку пранікнуць у таямніцы навакольнага свету, захаваць знаёмыя вобразы на доўгія гады.

## Пытанні і заданні

1. Уважліва разгледзьце фатаграфіі, прадстаўленыя ў параграфе. Падзяліцеся з аднакласнікамі сваімі ўражаннямі ад іх.

Паглядзіце на кампакт-дыску фатаграфіі С. М. Пракудзіна-Горскага і Я. Булгака пачатку 20 стагоддзя. Ахарактарызуйце адну з іх.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

### Творчая майстэрня

2. Стварыце з дапамогай адной з даступных камп’ютарных праграм невялікі альбом з фатаграфій вашай сям’і (аднакласнікаў, сяброў).

## § 29–30. Тэлебачанне

Яшчэ адным спосабам распаўсюджвання інфармацыі з’яўляецца *тэлебачанне*. Кожны чалавек можа выбраць тую тэлеперадачу, якая яму асабліва падабаецца. Хтосьці рэгулярна праглядае выпускі навін ці трансляцыі спартыўных спаборніцтваў. Хтосьці аддае перавагу праграмам пра кулінарыю ці дызайн інтэр’ераў. А хтосьці — пазнавальным перадачам пра свет жывёл. Тэлебачанне можа паказаць чалавеку тое, што яму цікава. Кожны канал мае сваю праграму. Але выбірае менавіта глядач.





Першыя савецкія тэлевізары 1930-х гг. (экран 3×4 см, вага — больш за 30 кг)

Тэлебачанне ахоплівае ўсю разнастайнасць нашых інтарэсаў. Вядома, мы можам атрымаць неабходную інфармацыю і з іншых крыніц: кніг, часопісаў, газет. Але ў тэлебачання ёсць перавага. Уключаючы тэлевізар, мы не толькі знаёмімся з інфармацыяй. Мы нібы знаходзімся побач з тым, што адбываецца. Такі эфект атрымаў назву «эфект прысутнасці». Дамагчыся эфекту прысутнасці, зрабіць выяву на экране цікавай, сумясціць гук з выявай — гэта ўжо не проста перадача інфармацыі. Гэта мастацтва!

Слова «тэлебачанне» як быццам узята з казкі ці з фантастычнай гісторыі. Выява і гук раскладваюцца на асобныя элементы. Гэтыя элементы перадаюцца па правадах ці з дапамогай радыёсігналу, а затым ізноў «збіраюцца» ў перша-



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

пачатковай паслядоўнасці і ператвараюцца ў эфектную выяву, якая гучыць.

Першая тэлеперадача адбылася 26 чэрвеня 1928 года ў горадзе Ташкенце. Першы тэлевізійны прыёмнік атрымаў назву «тэлефот».

**Тэлеба́чанне** — перадача рухомай выявы і гуку на адлегласці.

Тэлевізары ў момант з'яўлення тэлебачання былі вялікай рэдкасцю. Яны каштавалі вельмі дорага — амаль як паўаўтамабіля. Каб глядзець перадачы на маленькіх экранах, зверху на іх навешвалі вялікае павелічальнае шкло.

Першыя тэлеперадачы былі *інфармацыйнымі*. Напрыклад, выпускі навін і выступленні дзяржаўных асоб. Інфармацыйныя праграмы папулярныя і сёння. У іх паведамляецца пра тое, што адбываецца ў свеце: у эканоміцы, культуры, спорце.

Сучасныя тэлевізійныя прыёмнікі даступныя вялікай колькасці людзей, а якасць тэхнікі дасягнула высокага ўзроўню. Тэлебачанне стала вельмі разнастайным. Асаблівую папулярнасць атрымалі забаўляльныя і пазнавальныя перадачы.

*Забаўляльнае* тэлебачанне паказвае канцэрты, тэлефільмы і спецыяльныя тэлепраекты. *Пазнавальнае* — знаёміць гледачоў з цікавымі сюжэтамі з розных абласцей ведаў. Гэта могуць быць праграмы



Тэлевізійны спартыўны рэпартаж



Перадача пра жывёл (тэлеканал Animal Planet)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне




Праект «Новыя падарожжы дылетанта» (тэлеканал «СТБ»)

пра дзікую прыроду, навуковыя эксперыменты, гістарычныя падзеі, вандроўкі і славутасці.

Адны перадачы вядуцца *ў прамым эфіры*. Глядач у рэальным часе можа ўбачыць і пачуць тое, што адбываецца ў самых далёкіх кутках планеты. Гэтым тэлебачанне адрозніваецца ад фатаграфіі, радыё і кінематографа. Іншыя перадачы тэлебачанне транслюе *ў запісе*. Але галоўная асаблівасць тэлемастацтва — эфект прысутнасці гледача ў падзеях па той бок экрана — захоўваецца заўсёды.

У тэлебачанні, як і ва ўсіх іншых абласцях мастацкай творчасці, існуюць свае правілы і законы. Яны складаліся паступова. Напрыклад, у кінематографе, каб аператар мог зняць толькі адно дзеянне, акцёр здзяйсняе яго некалькі разоў. На тэлебачанні дзеянне здымаецца дзвюма-трыма камерамі, і яго не даводзіцца паўтараць. Затым усе камеры па чарзе транслююць выяву, а глядач, знаходзячыся перад экранам тэлевізара, становіцца актыўным удзельнікам падзей.

Роўна гэтак жа запісваецца і перадаецца адразу праз некалькі мікрафонаў гук. Адзін мікрафон — для дыктара, па другім — шуміць вецер, а па трэцім — рэпарцёр каментуе выяву. У кіно гук накладваецца на знятую выяву паэтапна — спачатку вецер, затым закадравае маўленне, а потым музыка.


Правообладатель Адукацыя і выхаванне


Работа тэлевізійнай студыі

Такія прыёмы выкарыстоўваюцца для таго, каб паказаць усё, што адбываецца ў прамым эфіры, найбольш ярка і выразна.

І ў кіно, і на тэлебачанні мы бачым рухомую выяву і чуем гук. Але толькі тэлебачанне стварае эфект «тут і цяпер»!

**Пытанні і заданні**

1. Якія тэлеперадачы вы гледзіце часцей — інфармацыйныя, пазнавальныя ці забаўляльныя? Назавіце адну з любімых тэлеперадач. Растлумачце свой выбар.

**Творчая майстэрня**

2. Падрыхтуйце з аднакласнікамі праект інфармацыйнай, пазнавальнай ці забаўляльнай тэлеперадачы «Галоўная падзея ў нашым класе». Прадумайце асноўныя ролі — аўтар тэксту, фатограф (аператар), дыктар.

## § 31–33. Камп’ютарнае мастацтва

У паўсядзённым жыцці мы часта сутыкаемся з творамі камп’ютарнага мастацтва. Але ці звяртаем мы ўвагу на тое, як дакладна прамаляваны персанаж у камп’ютарнай гульні? Ці заўважаем

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

незвычайны будынак або ландшафт у сучасным мастацкім фільме? А ўсё гэта мастак стварае з дапамогай камп'ютарнай тэхнікі.

Мастацкі твор, створаны на камп'ютары, — гэта таксама твор мастацтва! У яго аснову пакладзены матэматычныя законы і паняцці, напрыклад прапорцыі. Але калі пры стварэнні твораў традыцыйных відаў мастацтва гэтыя параметры задае сам аўтар, то ў сучасным мастацтве для гэтага часта выкарыстоўваюцца тэхніка і формулы.

Так, паступова з лічбаў, літар, а потым і пікселяў[3] пачалося нараджэнне камп'ютарных відаў мастацтва — *графікі, анімацыі, музыкі*.

**Камп'ю́тарнае мастацтва** — від мастацтва, творы якога ствараюцца і дэманструюцца з дапамогай камп'ютарных тэхналогій.

*Камп'ютарная графіка* адкрыла перад майстрамі мастацтва новыя гарызонты. Яна шырока выкарыстоўваецца ў кінематографе, тэлебачанні, рэкламе, камп'ютарных гульнях, прэзентацыях. З дапамогай спецыяльных праграм і інструментаў мастакі камп'ютарнай графікі сёння могуць стварыць і апрацаваць любы малюнак, змадэляваць любы прадмет.

Эксперыменты па стварэнні мастацкіх вобразаў з дапамогай камп'ютарнай графікі далі нечаканы вынік. У мастакоў камп'ютарнай графікі з'явіліся больш шырокія магчымасці ўвасабляць прадметы, людзей, жывёл, а таксама выдуманых персанажаў. Для гэтага творцы звяртаюцца і да прыёмаў графічнага мастацтва, выкарыстоўваючы такія сродкі выразнасці, як контурныя лініі, штрыхі.

Сучасны іспанскі мастак Дана́та Ф'е́ра-Пе́рэс на карціне «Немагчымае каханне» стварае ілюзію новага Сусвету. У сваіх творах ён злучае, накладвае адзін на аднаго і апрацоўвае з дапамогай інструментаў камп'ютарнай графікі розныя вобразы. «Блытаючы» мінулае і сучаснасць, рэальнае і фантастычнае, аўтар будзіць фантазію

[3] Пі́ксель — мінімальны і непадзельны элемент (кропка), з якога складаецца выява на экране манітора.


Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Даната Ф’ера-Перэс.** Немагчымае каханне

гледача, заклікае паглядзець на звыклыя з’явы ў новым, нечаканым ракурсе.

Укараненне камп’ютарных тэхналогій у кінематограф прывяло да нараджэння *камп’ютарнай анімацыі*. Гэта паскорыла творчы працэс, дазволіўшы плоскую выяву зрабіць аб’ёмнай, нерухомую — жывой. У 1968 годзе ў СССР быў створаны мультфільм «Кошачка» з першым анімаваным камп’ютарным персанажам. Камп’ютар мадэляваў рухі жывёлы і выводзіў на прыстасаванне для друку. Асобныя кадры былі сабраны ў стужку.



Кадр з анімацыйнага фільма «Кошачка» (рэжысёры Віктар Мінáхін, Мікалай Канстанцíнаў)

Першы мультфільм, створаны пры дапамозе трохмернай камп’ютарнай графікі, — «Гісторыя цацак». У 1995 годзе ажыўшыя цацкі ў трохмернай выяве зрабілі на гледача незабыўнае ўражанне. 3D-мадэлі хутка сталі папулярнымі і паступова выцеснілі з анімацыі лялек.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Кадр з анімацыйнага фільма «Гісторыя цацак» (рэжысёр Джон Ласе́тэр)

Асаблівы прыём камп'ютарнай анімацыі выкарыстала ў фільме «Рыжык у Залюстроўі» беларускі рэжысёр Алена Віктараўна Турава. Анімаваны персанаж з'яўляецца побач з сапраўдным акцёрам і ўзаемадзейнічае з ім. Дзякуючы гэтаму ў гледача ўзмацняецца адчуванне цуду і чараўніцтва.

Мастацкі фільм «Рыжык у Залюстроўі» (фрагмент) (рэжысёр Алена Турава)

Камп'ютарная анімацыя ў кінематографе не толькі спрашчае і паскарае творчы працэс. Яе магчымасці амаль бязмежныя. Камп'ютар дазваляе імітаваць любыя матэрыялы, стыль, тэхніку. Сёння прымяненне камп'ютарнай анімацыі дазваляе «ажывіць» не толькі герояў кіно, але і асобныя элементы афармлення кніг, рэкламы, старонак інтэрнэту.



Кадр з фільма «Рыжык у Залюстроўі» (рэжысёр Алена Турава)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Сігу́рні Уі́вер і Сэм Уо́рцінгтан на здымках фільма «Аватар»



Здымкі фільма «Парк Юрскага перыяду»

Камп'ютарная тэхніка ўвесь час удасканальваецца. І ў анімацыйных, і ў гульнявых фільмах мастакі сёння дасягаюць фатаграфічнай дакладнасці і рэалістычнасці. Магчыма, хутка з дапамогай камп'ютара можна будзе замяніць акцёраў-жывёл і акцёраў-людзей на віртуальных персанажаў.

У сучасным кіно папулярнай становіцца тэхналогія «захоп руху». Да прыкладу, у фільме «Аватар» амерыканскага рэжысёра Джэ́ймса Кэ́мерана да адзення акцёра прымацоўваліся спецыяльныя датчыкі, якія фіксавалі яго міміку і рухі. Дадзеныя з дапамогай тэхнікі «захопліваліся» і ўводзіліся ў трохмерную мадэль, якая імітавала рухі акцёра. Пасля складаных тэхнічных маніпуляцый мадэль пачынала рухацца…

Не менш папулярная і тэхналогія «аніматронік». Гэта мадэль чалавека або жывёлы. Яе выкарыстоўваюць пры стварэнні складаных персанажаў. Напрыклад, у фільме «Парк Юрскага перыяду» Сты́вена Спі́лберга мадэль дыназаўра важыла амаль шэсць тон! Але ў фільме персанаж выглядае цалкам рэалістычна.

Намаляваныя дэкарацыі таксама не страцілі сваёй актуальнасці. Але калі ў 20 стагоддзі мастакі стваралі іх рукамі, то сёння малююць або апрацоўваюць на камп'ютары. Намаляваныя дэкарацыі неабходныя тады, калі няма магчымасці зняць натуральныя. Дасягаючы фотарэалістычных малюнкаў, мастакі ствараюць у кіно ілюзію навакольнага асяроддзя — гарадскіх і прыродных пейзажаў.



Кадр з фільма «Уладар пярсцёнкаў: Братэрства пярсцёнка» (рэжысёр Пі́тэр Джэ́ксан)

Наватарствам у сферы музычнага мастацтва з'яўляюцца *электронная* і *камп'ютарная музыка*. Французскі кампазітар Жан-Мішэ́ль Жар адным з першых пры стварэнні музычнага твора выкарыстаў электронныя інструменты і сінтэзатар. З дапамогай тэхнікі музыкант змог зрабіць сапраўдныя светлавыя шоу. Партытура кампазіцыі «О́ксіджэн», узбагачаная колеравай вясёлкай, імітуе рух Зямлі, Космасу. Так камп'ютарныя тэхналогіі атрымалі ўвасабленне адразу і ў гуку, і ў колеры, і ў пэўнай форме.



**Жан-Мішэль Жар.**
Ігра на лазернай арфе

Камп'ютарная тэхніка дапамагла рэалізаваць тое, што раней цяжка было зрабіць намаганнямі толькі аднаго чалавека. Зараз мастак можа тварыць, пакінуўшы машыне лічбы, схемы і формулы. Дзякуючы новым магчымасцям у мастацтве адкрылася прастора для новых тэм і вобразаў.

### Пытанні і заданні

1. Уважліва разгледзьце работу Д. Ф'ера-Перэса, прадстаўленую ў параграфе. Які эмацыйны водгук выклікае ў вас гэты твор?


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Знайдзіце ў інфармацыйных крыніцах і паглядзіце анімацыйны фільм «Гісторыя цацак». У чым заключаецца перавага камп'ютарнай анімацыі?

Знайдзіце ў інфармацыйных крыніцах і праслухайце музычныя кампазіцыі Ж.-М. Жара і групы Space. Якія пачуцці выклікае ў вас музыка? Які эфект дасягнуты музыкантамі з дапамогай тэхнікі?

### Творчая майстэрня

2. Выканайце эскіз анімацыйнага персанажа ў даступным графічным рэдактары.

Паглядзіце ў інфармацыйных крыніцах фрагменты мастацкіх фільмаў, прадстаўленых у параграфе. Звярніце ўвагу на спецэфекты. У чым заключаецца перавага камп'ютарнай тэхнікі?

3. Выканайце калаж на тэму «Гарадскі пейзаж», падабраўшы з газет, часопісаў, фотаздымкаў фрагменты пейзажаў, створаных у розных тэхніках. Што ў вас атрымалася?

Азнаёмцеся з дадатковай старонкай на кампакт-дыску да раздзела «Мастацтва "на кончыках пальцаў"». Выканайце заданні.

## § 34–35. Творчы праект

Сучасны свет шматгранны і часта непрадказальны. Штодзень у нас узнікае мноства розных пытанняў. Задумваючыся над імі, чалавек пачынае шлях творчасці. Кожны новы адказ — новая творчасць. Часам гэты адказ выражаецца ў форме слоў, часам — у выглядзе ліній і штрыхоў, у некаторых выпадках гэта новая песня ці відэазамалёўка… Чым больш пытанняў — тым больш творчых адказаў!

У канцы навучальнага года важна ўспомніць свае творчыя работы, расказаць пра іх у арыгінальнай форме аднакласнікам.

Можна стварыць новы праект на цікавую тэму. Магчыма, гэта будзе новая жывапісная ці графічная работа, інсцэніроўка невялікай казкі, байкі ці апавядання або арыгінальная фотазамалёўка пра жыццё класа… Кожны з вас можа сканцэнтраваць сваю ўвагу толькі на тым відзе мастацкай творчасці, які падабаецца.

А можна прысвяціць апошнія ўрокі яшчэ адной сустрэчы з творамі мастацтва, якія вам асабліва запомніліся. Вы пазнаёміліся з дзіўнымі

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Аліна Куля́шава,**
11 гадоў. «Мы любім кіно»
(г. Магілёў, Беларусь)

героямі тэатральных пастановак і кінастужак; разважалі пра пачуцці, учынкі, узаемаадносіны. І, вядома ж, пра тое, як пачуцці і ўчынкі герояў увасоблены ў творах мастацтва.

Раскажыце пра свае ўражанні аднакласнікам. Для таго каб ваша паведамленне было выразным і арыгінальным як самастойны твор мастацтва, вы можаце выкарыстоўваць пытанні:

- Якую сцэну можна было б сфатаграфаваць для афішы спектакля (фільма)?
- Якую сцэну варта было б зняць для рэкламнага роліка пра спектакль (фільм)?
- Якая сцэна ў спектаклі (фільме) самая вясёлая?
- Якая сцэна ў спектаклі (фільме) самая сумная?
- У які момант вы асабліва востра перажывалі за кагосьці з герояў спектакля (фільма)?
- У які момант хацелася чым-небудзь дапамагчы героям? Чым?
- Ці былі незразумелыя моманты ў спектаклі (фільме)?
- Як можна апісаць дэкарацыі ў спектаклі (фільме)?
- Для чаго мастак і рэжысёр спектакля (фільма) выбралі менавіта такія дэкарацыі?


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

- Якімі словамі можна апісаць характар касцюмаў у спектаклі (фільме)?
- Чаму мастак вырашыў апрануць персанажаў менавіта ў такія касцюмы?
- Як вы думаеце, якую ролю ў спектаклі (фільме) выконваюць харэаграфічныя і вакальныя нумары?
- Якімі словамі можна апісаць баі і бойкі ў спектаклі (фільме)?
- Якімі спосабамі ў спектаклі (фільме) ствараюцца яркія, незвычайныя эфекты?
- Хто з акцёраў запомніўся выразным выкананнем ролі?
- Хто з акцёраў так выканаў сваю ролю, што яго герою (гераіні) вы суперажывалі больш за ўсё?
- Якую сцэну спектакля (фільма) вы хацелі б паглядзець яшчэ раз? Чаму?
- З кім са стваральнікаў спектакля (фільма) вы хацелі б пагаварыць? Пра што?
- Што б вы спыталі ў акцёраў, занятых у спектаклі (фільме)?
- Што б вы сказалі рэжысёру і іншым стваральнікам спектакля (фільма)?
- Што б вы расказалі аднагодку, які не бачыў гэтага спектакля (фільма)?
- На якім спектаклі вы хацелі б пабываць у тэатры? Які фільм вы хацелі б паглядзець?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# ЗМЕСТ

**УВОДЗІНЫ** ........................................ 4
§ 1. Вечныя тэмы ў мастацтве ........................................ 5

Раздзел 1. **МАСТАЦТВА ПРА МАСТАЦТВА** ........................................ 10
§ 2. Жанрава-відавая разнастайнасць мастацтва ........................................ 11
§ 3. Сродкі мастацкай выразнасці ........................................ 15
§ 4. Вобраз творцы ў мастацтве ........................................ 19
§ 5. Узаемасувязь і ўзаемапранікненне відаў мастацтва ........................................ 24

Раздзел 2. **ДЫЯЛОГІ Ў МАСТАЦТВЕ** ........................................ 28
§ 6. Дыялог мастацтваў ........................................ 29
§ 7. Садружнасць мастацтваў ........................................ 33

Раздзел 3. **МІФАЛОГІЯ Ў МАСТАЦТВЕ** ........................................ 38
§ 8–9. Міфалогія як сістэма ўяўленняў чалавека пра свет ........................................ 39
§ 10. Міфы пра стварэнне і ўладкаванне свету ........................................ 45
§ 11. Міфы пра стварэнне чалавека і прыроднага свету ........................................ 49
§ 12. Жаночы вобраз у міфалогіі ........................................ 53

Раздзел 4. **СВЯТА Ў ЖЫЦЦІ ЛЮДЗЕЙ** ........................................ 58
§ 13–14. Святы ў розных культурах свету ........................................ 59

Раздзел 5. **ТЭАТР БАЧНЫ І НЯБАЧНЫ** ........................................ 66
§ 15. Вытокі тэатра ........................................ 67
§ 16–18. Сродкі мастацкай выразнасці ў тэатральным мастацтве ........................................ 71
§ 19. Як уладкаваны тэатр ........................................ 76
§ 20. Музычны тэатр: опера і балет ........................................ 81


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Раздзел 6. **КІНО — ДЗЯСЯТАЯ МУЗА** ........................................86
§ 21. Паходжанне кінамастацтва ..................................................87
§ 22–23. Гульнявое (мастацкае) кіно ..........................................92
§ 24–25. Асаблівасці кінамовы ....................................................96
§ 26. Анімацыйнае кіно ...............................................................101

Раздзел 7. **МАСТАЦТВА «НА КОНЧЫКАХ ПАЛЬЦАЎ»** ..........108
§ 27–28. Фатаграфія як від мастацтва .......................................109
§ 29–30. Тэлебачанне .................................................................. 114
§ 31–33. Камп’ютарнае мастацтва ............................................. 117
§ 34–35. Творчы праект .............................................................123

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

(Назва і нумар установы адукацыі)

| Навучальны год | Імя і прозвішча вучня | Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні | Адзнака вучню за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |


Вучэбнае выданне

**Захарына** Юлія Юр'еўна
**Колбышава** Святлана Іванаўна
**Грачова** Вольга Алегаўна
**Маруноў** Аляксандр Аляксандравіч

**МАСТАЦТВА**
**(айчынная і сусветная мастацкая культура)**

Вучэбны дапаможнік для 6 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання
(з электронным дадаткам)

Рэдактары *Т. А. Іванова, Л. В. Саламаха*
Дызайн *В. К. Жалудковай, І. І. Радаман*
Мастацкія рэдактары *В. К. Жалудкова, Д. В. Кашавар, К. К. Шастоўскі*
Мастак вокладкі *В. К. Жалудкова*
Мастакі *К. У. Максімава, К. К. Шастоўскі*
Камп'ютарны набор *Т. А. Івановай, К. К. Шастоўскага*
Камп'ютарная вёрстка *В. К. Жалудковай, В. Ю. Лагун, К. К. Шастоўскага*
Карэктары *Т. А. Іванова, Г. Д. Мікіцюк*

*У мастацкім афармленні выдання выкарыстаны ілюстрацыі з wikimedia.org, shutterstock.com і іншых крыніц (поўны пералік на дыску).*

Падпісана да друку 15.12.2016. Фармат 70 × 100 1/16. Папера афсетная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 10,4. Ул.-выд. арк. 6,0 + 4,0 эл. дад. Тыраж 16 750 экз. Заказ .

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва "Адукацыя і выхаванне"».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/19 ад 14.11.2014. Вул. Будзённага, 21, 220070, г. Мінск.

Адкрытае акцыянернае таварыства «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/3 ад 04.10.2013. Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, г. Мінск.


Правообладатель Адукацыя і выхаванне









ISBN 978-985-471-929-0